Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________ Н. У. Карчэўская
«___» ______________2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАГРАМА ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках),
*напрамках спецыяльнасці*
*1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент),*
*1-23 01 11-02 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (аўтаматызацыя),*
*1-23 01 11-04 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (метадычнае забеспячэнне)*

2018

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Н. У. Балукова*, старшы выкладчык кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*І. Л. Беланоўская*, старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*В. М. Бігеза,* дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*Ю. М. Галкоўская*, загадчык кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*С. В. Зыгмантовіч*, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*А. Ю. Казленка*, дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н. У. Клімянкова,* прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*А. Э. Паліцэвіч*, старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;

*С. А. Паўлава,* прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*Б. В. Пятрэнка*, дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат тэхнічных навук, дацэнт;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ж. Л. Раманава,* загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;
*В. І. Саітава*, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Т. С. Юхнавец*, старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*М. А. Яцэвіч*, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*А. М. Пісарэнка,* прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 26.01.2018 г.);
кафедрай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 26.01.2018 г.);
саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 30.01.2018 г.);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 22.02.2018 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказныя за выпуск: Ю. М. Галкоўская, Ж. Л. Раманава,
М. А. Яцэвіч, В. І. Саітава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) з'яўляецца формай выніковай атэстацыі студэнтаў і праводзіцца ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам ОСВО 1-23 01 11-2014 Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Пры падрыхтоўцы праграмы дзяржаўнага экзамену былі выкарыстаны навуковыя вынікі, атрыманыя пры выкананні навукова-даследчай работы па заданні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Распрацаваць методыку ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк па стварэнні электронных інфармацыйных рэсурсаў» (№ дзярж. рэг. 20170558).

*Мэтай* дзяржаўнага экзамену з'яўляецца праверка ўзроўню і якасці ведаў выпускніка згодна з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі. Да дзяржаўнага экзамену выпускнік павінен авалодаць акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі і прафесійнымі кампетэнцыямі, авалодаць прафесійнай кампетэнтнасцю для работы ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, мець высокі ўзровень гатоўнасці для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці па напрамку атрымліваемай спецыяльнасці.

Для выпускнікоў, якія навучаліся па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент), праводзіцца дзяржаўны экзамен па вучэбнай дысцыпліне «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент».

Для выпускнікоў, якія навучаліся па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-02 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (аўтаматызацыя), праводзіцца дзяржаўны экзамен па вучэбнай дысцыпліне «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы».

Для выпускнікоў, якія навучаліся па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (метадычнае забеспячэнне), праводзіцца дзяржаўны экзамен па вучэбнай дысцыпліне «Метадычнае забеспячэнне дзейнасці розных тыпаў бібліятэк».

Дзяржаўны экзамен па напрамку спецыяльнасці ўключае пытанні па спецыяльных вучэбных дысцыплінах, уключаных у вучэбны план і адпавядаючых напрамку спецыяльнасці. Пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грама дзяржаўнага экзамену па вучэбных дысцыплінах напрамку складаецца з трох раздзелаў: «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент», «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы», «Метадычнае забеспячэнне дзейнасці розных тыпаў бібліятэк». Такая структура праграмы дзяржаўнага экзамену дазваляе лагічна і сістэмна размеркаваць вучэбны матэрыял зыходзячы з напрамку спецыяльнасці.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам на дзяржаўным экзамене выпускнік напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент) павінен *ведаць:*

– стан і тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– інфраструктуру сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– суб’ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– каштоўнасныя арыентацыі ў стварэнні сацыяльна-культурнага асяроддзя ў бібліятэках;

– сутнасць і асноўныя этапы тэхналагічнага працэсу сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– мэты, задачы, функцыі і прынцыпы рэалізацыі тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– формы, метады і выразныя сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– метадалогію бібліятэчнай эканамічнай навукі;

– гісторыю ўзнікнення і развіцця эканамічных адносін у бібліятэчнай сферы;

– змест эканомікі бібліятэчнай дзейнасці, структуру знешняй і ўнутранай эканамічнай прасторы бібліятэкі;

– тыпы, формы і прынцыпы фінансавання бібліятэчна-інфармацыйных устаноў;

– механізмы фінансавання бібліятэк розных тыпаў і відаў;

– асновы тэорыі інавацый і інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту;

– тэарэтыка-метадалагічныя асновы кіравання інавацыйным працэсам у бібліятэцы;

– кірункі і прынцыпы навукова-метадычнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці бібліятэк;

– методыку ацэнкі эфектыўнасці інавацыйна-метадычнай дзейнасці бібліятэкі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асноўныя паняцці, катэгорыі, прынцыпы і метады тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту;

– нарматыўныя дакументы ў сферы дакументацыйнага забеспячэння кіравання;

*умець:*

– выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў прафесійнай і навуковай дзейнасці;

– праводзіць параўнальны аналіз і ацэнку розных тэарэтычных канцэпцый у сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк з мэтай прымянення назапашаных ведаў у практычнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць вопыт работы ўстаноў культуры ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк розных тыпаў;

– распрацоўваць праграмы тэхналагічнага працэсу сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэцы, ажыццяўляць іх аналіз, дыягностыку і рэфлексію;

– арганізоўваць масавыя, групавыя і індывідуальныя формы сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– складаць сцэнарныя планы і сцэнарыі разнастайных форм культурна-дасугавых праграм;

– выкарыстоўваць мікраэканамічны падыход да кіравання бібліятэкай;

– разлічваць артыкулы каштарысу бібліятэкі і размяркоўваць адзіны фонд фінансавых сродкаў бібліятэкі;

– выкарыстоўваць мадэлі гаспадарчай дзейнасці і вызначаць паказчыкі эфектыўнасці гаспадарання;

– разлічваць нарматывы бюджэтных фінансавых асігнаванняў на асноўныя тэхналагічныя цыклы бібліятэчнай вытворчасці;

– выкарыстоўваць тэарэтычныя, арганізацыйна-метадычныя і тэхнолага-інавацыйныя веды ў прафесійнай практычнай і навуковай дзейнасці;

– карыстацца маркетынгавай стратэгіяй развіцця бібліятэкі для пашырэння наменклатуры інавацыйнай прадукцыі, засваення новых тэхналогій навуковай і інавацыйна-метадычнай вытворчасці;

– распрацоўваць мерапрыемствы павышэння эфектыўнасці інавацыйна-метадычнай дзейнасці бібліятэкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкарыстоўваць вопыт работы ўстаноў культуры ў галіне інавацыйна-метадычнай дзейнасці бібліятэк;

– вызначыць эфектыўнасць бібліятэчнай тэхналогіі шляхам правядзення тэхніка-эканамічнага аналізу;

*валодаць:*

– сучаснымі метадамі эфектыўнай сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– методыкамі аналізу культурна-дасугавага асяроддзя бібліятэкі;

– навыкамі планавання, кантролю, уліку і справаздачнасці па выніках рэалізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках;

– драматургічнымі і рэжысёрскімі асновамі арганізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках;

– асновамі распрацоўкі наменклатуры фінансава-коштавых паказчыкаў бібліятэчнай работы;

– навыкамі складання штатнага раскладу бібліятэкі і вызначэння групы па аплаце працы;

– навыкамі складання інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў па прыярытэтных кірунках інавацыйна-метадычнай дзейнасці;

– методыкамі распаўсюджвання інавацыйна-метадычнага вопыту;

– тэхналогіяй электроннага дакументазвароту ў бібліятэцы;

– методыкамі распрацоўкі і мадэлявання бібліятэчнай тэхналогіі.

Выпускнік напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-02 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (аўтаматызацыя) павінен *ведаць:*

– сродкі інфармацыйнага і лінгвістычнага забеспячэння АБІС і асноўныя патрабаванні да іх;

– віды фарматаў, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС;

– методыку стварэння бібліяграфічных і аўтарытэтных запісаў у фармаце BELMARC;

– міжнародныя і нацыянальныя базы даных аўтарытэтных запісаў, электронныя каталогі;

– тэхналогію фарміравання і выкарыстання лінгвістычнага забеспячэння ў АБІС;

– праблемы інтэграцыі інфармацыйнага і лінгвістычнага забеспячэння ў бібліятэках Беларусі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– праблемы сумяшчэння сродкаў лінгвістычнага забеспячэння АБІС;

– віды праграмнага забеспячэння АБІС і асноўныя патрабаванні да яго;

– СКБД, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС;

– прынцыпы апрацоўкі сігналаў, іх пераўтварэнне; пазіцыйныя сістэмы злічэння;

– этапы развіцця камп'ютарнай тэхнікі;

– прынцыпы пабудовы, склад, архітэктуру і асноўныя падсістэмы сучасных ЭВМ;

– тыпы і віды перыферыйнага абсталявання;

– патрабаванні тэхнікі бяспекі і вытворчай санітарыі пры рабоце з камп'ютарнай тэхнікай;

– асновы тэорыі камп'ютарных сетак;

– класіфікацыю бібліятэчных камп'ютарных сетак;

– тапалогію і архітэктуру бібліятэчных камп'ютарных сетак;

– платы сеткавага адаптара і мадэлі камп'ютарных сетак;

– пратаколы і стандарты перадачы даных у камп'ютарных сетках;

– сеткавае праграмнае забеспячэнне;

– асаблівасці адміністравання і абароны інфармацыі ў бібліятэчных камп'ютарных сетках;

– тэарэтычныя асновы праектавання АБІС;

– нацыянальныя і міжнародныя стандарты праектавання аўтаматызаваных сістэм;

– асноўныя этапы праектавання сістэмы;

– методыку распрацоўкі тэхнічнага задання на сістэму і яе асноўных падсістэм;

– методыку ацэнкі эфектыўнасці АБІС;

*умець:*

– ствараць і ўводзіць бібліяграфічныя запісы на розныя віды дакументаў у фармат пэўнай АБІС;

– фарміраваць базы даных у фармаце BELMARC;

– распрацоўваць, выкарыстоўваць розныя сродкі лінгвістычнага забеспячэння;

– ствараць разнастайныя аўтарытэтныя файлы і фарміраваць адпаведную базу даных;

– падтрымліваць у актуальным стане сродкі інфармацыйна-лінгвістычнага забеспячэння АБІС;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– аналізаваць рынак праграмнага забеспячэння;

– падключаць і праводзіць настройку асноўных параметраў ПЭВМ;

– выконваць установку і інсталяцыю перыферыйных устройстваў; падключэнне камп'ютараў да Інтэрнэту;

– праводзіць тэсціраванне прадукцыйнасці і непашкоджанасці камп'ютарнага абсталявання;

– выбіраць канфігурацыю камп'ютарнай тэхнікі да патрэб канкрэтнай бібліятэкі;

– арганізоўваць працоўнае месца і рэжым работы з камп'ютарнай тэхнікай;

– вызначаць асноўныя характарыстыкі сеткавых кампанентаў;

– працаваць у асяроддзі розных відаў бібліятэчных кап'ютарных сетак;

– выкарыстоўваць інтэрнэт-тэхналогіі;

– выкарыстоўваць бібліятэчны карпаратыўны пратакол Z 39.50;

– адміністраваць бібліятэчныя камп'ютарныя сеткі;

– вызначаць пералік функцыянальных задач бібліятэкі, якія падлягаюць аўтаматызацыі;

– распрацоўваць арганізацыйна-тэхналагічную структуру АБІС;

– праектаваць сродкі інфармацыйна-лінгвістычнага забеспячэння;

– аналізаваць рынак праграмна-тэхнічных сродкаў;

– рабіць разлік выдаткаў на праектуемую сістэму;

– распрацоўваць тэхнічнае заданне на праектуемую сістэму;

*валодаць*:

– методыкай стварэння бібліяграфічных запісаў на розныя віды дакументаў у фармаце BELMARC з выкарыстаннем баз даных аўтарытэтных запісаў і ўвядзеннем іх у фармат пэўнай АБІС;

– методыкай стварэння аўтарытэтных запісаў на розныя энцітэты ў фармаце BELMARC;

– тэхналогіяй стварэння базы даных аўтарытэтных запісаў;

– тэхналогіяй фарміравання і выкарыстання інфармацыйна-лінгвістычнага забеспячэння ў АБІС;

– методыкай работы з камп'ютарнай тэхнікай;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– метадамі тэхнікі бяспекі і вытворчай санітарыі пры рабоце з камп’ютарнай тэхнікай;

– метадамі ацэнкі прадукцыйнасці і непашкоджанасці камп’ютарнага абсталявання;

– агульнымі прыёмамі стварэння, выкарыстання і адміністравання бібліятэчных камп’ютарных сетак;

– метадамі абароны інфармацыі ў камп’ютарных сетках;

– распрацоўкай тэхнічнага задання на праектуемую сістэму;

– праектаваннем сродкаў інфармацыйна-лінгвістычнага забеспячэння;

– агульнымі прыёмамі распрацоўкі арганізацыйна-тэхналагічнай структуры АБІС.

Выпускнік напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (метадычнае забеспячэнне) павінен *ведаць:*

– віды і спецыфіку навуковых бібліятэчных даследаванняў, асаблівасці арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў розных тыпах бібліятэк;

– структуру і змест асноўных этапаў навукова-метадычнага даследавання;

– сутнасць, магчымасці, перавагі і недахопы асноўных тэарэтычных і эмпірычных метадаў, якія прымяняюцца пры даследаванні бібліятэчна-інфармацыйнных працэсаў і з’яў;

– асноўныя мэты, задачы і прынцыпы метадычнага маніторынгу;

– сутнасць, функцыі, задачы дзейнасці бібліятэкара-метадыста;

– мадэль прафесійных кампетэнцый метадыста;

– тыпалогію асобы метадыста;

– сістэму павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў;

– віды метадычных мерапрыемстваў і асаблівасці іх арганізацыі;

– аб’ём і змест паняццяў «рэгіён», «рэгіянальная культурная спадчына»;

– структуру бібліятэкі як поліфункцыянальнай установы ў галіне рэгіёназнаўства;

– ролю бібліятэкі ў збіранні, захаванні і папулярызацыі рэгіянальнай культурнай спадчыны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асноўныя гістарычныя перыяды развіцця рэгіёназнаўства ў Беларусі;

– традыцыйныя і інавацыйныя метады, формы збірання, захавання і папулярызацыі фіксаваных ведаў розных пластоў (галін) рэгіянальнай культурнай спадчыны;

– маркетынгавую стратэгію развіцця бібліятэкі для абгрунтавання асартыментнай палітыкі і пашырэння наменклатуры прадуктаў і паслуг, асваення тэхналогіі новых відаў бібліятэчна-інфармацыйнай вытворчасці (кансалтынгавай, навукова-аналітычнай, выдавецкай, педагагічнай, рэкламнай і інш.);

– асноўныя паняцці, катэгорыі, прынцыпы і метады тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту;

– нарматыўна-тэхналагічную дакументацыю тэхналагічнага менеджменту;

– асноўныя мэты, задачы і прынцыпы метадычнага маніторынгу;

– нацыянальныя і міжнародныя выдавецкія стандарты і правілы іх выкарыстання ў бібліятэцы;

*умець:*

– праводзіць вывучэнне сацыяльнай сістэмы (бібліятэкі) з выкарыстаннем методыкі сістэмна-дзейнаснага аналізу;

– паэтапна арганізоўваць навукова-метадычнае даследаванне ў бібліятэцы;

– вызначаць аптымальны комплекс метадаў для правядзення бібліятэчнага даследавання і ажыццяўляць яго, забяспечваць дакладнасць і абгрунтаванасць зыходных даных;

– аналізаваць вынікі навукова-метадычных даследаванняў, фармуляваць высновы і распрацоўваць практычныя рэкамендацыі;

– вывучаць перадавы вопыт дзейнасці бібліятэк і ўкараняць яго ў практыку;

– распрацоўваць арганізацыйна-распараджальныя, нарматыўныя і тэхналагічныя дакументы дзейнасці бібліятэк;

– аказваць кансультацыйна-метадычную дапамогу, складаць метадычныя рэкамендацыі і дапаможнікі;

– прымяняць псіхалага-педагагічныя веды ў метадычнай дзейнасці;

– наладжваць сувязі з грамадскасцю, установамі;

– самастойна арганізоўваць самаадукацыю;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– характарызаваць рэгiён па розных прыметах;
– вызначаць рэгiянальную спецыфiку тэрыторыi дзейнасцi бiблiятэкi;
– выкарыстоўваць гiстарычна-рэгiёназнаўчыя веды як кампанент прафесiйнай падрыхтоўкi для бiблiятэчна-iнфармацыйнай дзейнасцi;
– ствараць музейныя калекцыi;
– ствараць бiблiятэкi-музеi;
– распрацоўваць турыстычна-экскурсiйныя маршруты;
– ажыццяўляць дзейнасць па iнфармацыйным забеспячэннi рэгiянальнай турыстычна-экскурсiйнай дзейнасцi;
– выяўляць, даследаваць i выкарыстоўваць дакументальныя крынiцы ведаў аб рэгiёне;
– ажыццяўляць мадэляванне тэхналагiчных працэсаў;
– выкарыстоўваць iнфармацыйныя i камунiкатыўныя тэхналогii ў рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасцi;
– ажыццяўляць выдавецка-палiграфiчнае афармленне тэкставых арыгiналаў;

*валодаць:*
– рознымi методыкамi фармiравання сiстэмы эмпiрычных iндыкатараў для вымярэння аб'екта даследавання;
– методыкай i працэдурай навукова-метадычнага даследавання з выкарыстаннем розных даследчых метадаў;
– методыкай аналiзу бiблiятэчнай практыкi;
– спосабамi аналiзу эмпiрычных даных даследавання;
– методыкай прымянення iнфармацыйных тэхналогiй у метадычным забеспячэннi дзейнасцi бiблiятэк;
– спосабамi карэкцыi знешне- i ўнутрыбiблiятэчнага iмiджу;
– методыкай распрацоўкi i правядзення мерапрыемстваў па павышэннi квалiфiкацыi;
– тэрмiнамi i паняццямi беларускага рэгiёназнаўства;
– методыкай пошукава-даследчай дзейнасцi па вывучэннi рэгiянальнай культурнай спадчыны;
– тэхналогiяй ажыццяўлення розных вiдаў дзейнасцi ў сферы бiблiятэчнага рэгiёназнаўства;
– навыкамi падрыхтоўкi блок-схем, тэхналагiчных карт i маршрутных лiстоў;
– прыёмамi i метадамi нармiравання бiблiятэчных працэсаў;
– навыкамi даследавання кампазiцыйнай структуры тэксту;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– методыкай афармлення тэхнічнага, літаратурнага, бібліяграфічнага рэдагавання друкаванай прадукцыі.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) выпускнік павінен прадэманстраваць засваенне наступных кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі;

АК-4. Умець працаваць самастойна;

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем;

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю;

ПК-18. Выконваць патрабаванні заканадаўчых і нарматыўна-прававых дакументаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

ПК-19. Выкарыстоўваць маркетынгавы падыход да кіравання бібліятэчна-інфармацыйнымі ўстановамі;

ПК-21. Ажыццяўляць планаванне, улік і справаздачнасць бібліятэчна-інфармацыйнай работы;

ПК-22. Арганізоўваць работу малых калектываў у працэсе праектнай дзейнасці.

Спецыяліст напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент), акрамя таго, павінен прадэманстраваць засваенне:

ПК-23. Укараняць прынцыпы інавацыйнага менеджменту і сістэмы менеджменту якасці ў работу бібліятэкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-24. Выкарыстоўваць інструментарый тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту.

Спецыяліст напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-02 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (аўтаматызацыя), акрамя таго, павінен прадэманстраваць засваенне:

ПК-27. Суправаджаць інфармацыйна-лінгвістычнае і праграмна-тэхнічнае забеспячэнне АБІС;

ПК-28. Валодаць асновамі праектавання і стварэння баз даных, электронных бібліятэк, web-сайтаў;

ПК-29. Адміністраваць бібліятэчныя камп'ютарныя сеткі;

ПК-30. Ажыццяўляць методыку выбару АБІС на інфармацыйным рынку.

Спецыяліст напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (метадычнае забеспячэнне), акрамя таго, павінен прадэманстраваць засваенне:

ПК-35. Праводзіць метадычны маніторынг і метадычныя даследаванні ў бібліятэках розных тыпаў і відаў;

ПК-36. Выкарыстоўваць методыку фарміравання прафесійных кампетэнцый бібліёграфаў-метадыстаў;

ПК-37 Арганізоўваць і суправаджаць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк.

На падрыхтоўку да адказу на дзяржаўным экзамене студэнту адводзіцца не менш за 30 хвілін, на здачу дзяржаўнага экзамену адводзіцца да 30 хвілін. Адказ на дзяржаўным экзамене ажыццяўляецца ў вуснай форме. Падчас дзяржаўнага экзамену і адказу на пытанні білета студэнт можа атрымаць дадатковыя, у тым ліку ўдакладняючыя, пытанні колькасцю не больш трох.

У спіс літаратуры для падрыхтоўкі да дзяржаўнага экзамену ўключаны падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, а таксама асноўныя артыкулы вядучых спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы па актуальных праблемах развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці (па напрамках).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## Раздзел I. Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент

### *Тэма 1.1. Кіраванне персаналам у сістэме кіравання бібліятэкай: арганізацыйны аспект*

Сістэма кіравання персаналам у бібліятэцы як сукупнасць органаў кіравання (службовых асоб, структурных падраздзяленняў) і арганізацыйна-інфармацыйных сувязей паміж імі. Мэтавая накіраванасць і прынцыпы фарміравання сістэмы кіравання персаналам. Функцыі ўпраўленчых кадраў, кадравых службаў у бібліятэках у дачыненні да кіравання персаналам. Характарыстыка двух падыходаў да паняцця персаналу: «персанал-выдаткі» і «персанал-рэсурс».

Паняцце кадравай палітыкі. Змест і задачы кадравай палітыкі бібліятэкі, прынцыпы фарміравання. Узаемасувязь кадравай палітыкі і стратэгіі развіцця бібліятэкі. Кадравая праграма арганізацыі як састаўная частка плана развіцця бібліятэкі. Характарыстыка асноўных тыпаў кадравай палітыкі: пасіўная, рэактыўная, прэвентыўная, актыўная; адкрытая і закрытая. Этапы праектавання кадравай палітыкі і ўмовы яе распрацоўкі.

Прынцыпы кіравання персаналам у бібліятэцы. Метады кіравання персаналам: адміністрацыйныя, эканамічныя, сацыяльна-псіхалагічныя.

### *Тэма 1.2. Тэхналогія кіравання персаналам і яго развіццём у бібліятэцы*

Планаванне персаналу як адна з функцый кадравага менеджменту. Мэты, задачы і арганізацыя кадравага планавання.

Фарміраванне працоўных рэсурсаў як комплекс мерапрыемстваў па пошуку, адборы і найме супрацоўнікаў па колькасных і якасных паказчыках. Працоўная адаптацыя і развіццё персаналу бібліятэкі. Адаптацыя супрацоўнікаў у бібліятэцы: паняцце, змест, асноўныя мэты. Віды адаптацыі: першасная і другасная; прафесійная і сацыяльная. Асноўныя этапы працэсу адаптацыі: іх арганізацыйна-тэхналагічныя, псіхолага-педагагічныя асаблівасці. Прафесійнае развіццё персаналу як неабходная ўмова паспяховага функцыянавання бібліятэкі. Сістэма кіра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання прафесійным развіццём супрацоўнікаў бібліятэкі: прафесійнае навучанне, развіццё кар'еры, падрыхтоўка кадравага рэзерву. Ацэнка персаналу ў бібліятэцы. Мэты, прадмет ацэнкі, метады, сістэма ацэнкі персаналу. Атэстацыя супрацоўнікаў у бібліятэцы як адна з распаўсюджаных сістэм ацэнкі персаналу. Выкарыстанне і высвабаджэнне персаналу як функцыі кадравага менеджменту.

### *Тэма 1.3. Сацыяльна-псіхалагічны падыход да кіравання персаналам у бібліятэцы*

Сутнасць сацыяльна-псіхалагічнага падыходу да кіравання персаналам. Арганізацыя як распаўсюджаны від сацыяльных сістэм. Кіраванне сацыяльна-псіхалагічным станам арганізацыі як частка кіравання персаналам.

Маральна-псіхалагічны клімат бібліятэкі: характарыстыкі, стварэнне і падтрыманне ў калектыве. Асноўныя этапы і заканамернасці стварэння спрыяльнага маральна-псіхалагічнага клімату. Уменне перадаваць частку сваіх клопатаў падначаленым – паказчык паспяховай працы кіраўніка. Сітуацыі, якія пабуджаюць да дэлегавання паўнамоцтваў. Крытэрыі выбару супрацоўніка, якому можна даручыць свае клопаты. Правілы дэлегавання кіраўнічых паўнамоцтваў. Віды і формы кантролю за выкананнем. Заахвочванне і пакаранне. Правілы паводзін кіраўніка пры заахвочванні супрацоўніка. Правілы паводзін кіраўніка пры неабходнасці пакарання супрацоўніка. Уплыў маральна-псіхалагічнага клімату на эфектыўнасць асноўных кірункаў дзейнасці бібліятэкі. Арганізацыя вольнага часу супрацоўнікаў і іх сем'яў. Сацыяльна-псіхалагічныя метады кіравання.

### *Тэма 1.4. Дзелавая размова як камунікатыўны працэс*

Этапы дзелавой размовы. Падрыхтоўка да дзелавой размовы. Стварэнне атмасферы, спрыяльнай да дзелавой размовы. Пяць этапаў дзелавой размовы. Мэты і задачы пачатку размовы. Умовы аптымізацыі пачатку размовы і пераадолення перашкод. Мэты і задачы этапу інфармавання. Прыёмы эфектыўнага інфармавання. Мэты і задачы этапу аргументавання. Рытарычныя і спекулятыўныя прыёмы аргументавання: характарыстыка і межы ўжывання. Нейтралізацыя заўваг суразмоўніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перадумовы канструктыўнага завяршэння дзелавой размовы. Умовы, якія спрыяюць дасягненню згоды ў працэсе дзелавой размовы.

### *Тэма 1.5. Маркетынгавая інфармацыя і маркетынгавыя даследаванні*

Сістэма маркетынгавай інфармацыі, змест паняцця. Асноўныя элементы сістэмы маркетынгавай інфармацыі, іх узаемасувязь і характарыстыка. Узаемасувязь сістэмы маркетынгавай інфармацыі і маркетынгавага асяроддзя ў прыняцці маркетынгавых рашэнняў і рэалізацыі камунікацый.

Маркетынгавае асяроддзе: паняцце, структура, месца ў сістэме бібліятэчна-інфармацыйнага маркетынгу. Асаблівасці маркетынгавага бібліятэчнага асяроддзя.

Макраасяроддзе бібліятэкі: вызначэнне. Фактары макраасяроддзя: дэмаграфічны, палітычна-прававы, эканамічны, экалагічны, навукова-тэхнічны, сацыяльна-культурны і інш. Уплыў знешняга асяроддзя на эфектыўнасць дзейнасці бібліятэкі.

Мікраасяроддзе бібліятэкі.

Тэхналогія маркетынгавага даследавання ў бібліятэцы. Этапы маркетынгавага даследавання. Метады збору інфармацыі пры правядзенні маркетынгавага даследавання.

### *Тэма 1.6. Планаванне маркетынгавай дзейнасці бібліятэкі*

Маркетынгавае планаванне дзейнасці бібліятэкі: мэты, задачы. Напрамкі маркетынгавага планавання бібліятэкі: стварэнне рэпутацыі бібліятэкі; атрыманне знешняй падтрымкі. Асноўныя маркетынгавыя стратэгіі бібліятэкі.

Паняцце «стратэгічнае планаванне», роля стратэгічнага планавання ў забеспячэнні рыначнага поспеху бібліятэкі. Этапы стратэгічнага планавання.

Бізнес-планаванне: паняцце, функцыі. Бізнес-план: асаблівасці, віды, структура, методыка складання.

Фандрэйзінгавае планаванне: сутнасць, значэнне, формы і напрамкі. Асноўныя звёны дадатковай рэсурснай падтрымкі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Пошук і выбар бібліятэкай крыніц рэсурснай дапамогі (рэсурсных донараў): мецэнаты, спонсары і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 1.7. Прававая база стварэння і развіцця бібліятэк, сетак бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Асноўныя нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь і іх палажэнні, накіраваныя на стварэнне заканадаўчых умоў: фінансавага і матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк; узаемадзеяння бібліятэк са стваральнікамі; дабрачыннай дапамогі і спонсарства ў дачыненні да бібліятэк; прадпрымальніцкай дзейнасці бібліятэк. Гарантаванае фінансаванне дзяржаўных бібліятэк як абавязак дзяржавы ў галіне бібліятэчнай справы.

Прававыя асновы ўзаемадзеяння бібліятэк з іх стваральнікамі (адносіны ўласнасці, фінансаванне бібліятэк, атрыманне бібліятэкай статусу юрыдычнай асобы, рэарганізацыя і ліквідацыя бібліятэк). Арганізацыйныя формы існавання бібліятэк: самастойная ўстанова, філіял, структурнае падраздзяленне. Парадак стварэння бібліятэк. Юрыдычны статус бібліятэкі. Правамоцнасць распараджэння маёмасцю.

Правамернасць дабрачыннай дапамогі і спонсарства ў дачыненні да бібліятэк як некамерцыйных устаноў. Прававое рэгуляванне прадпрымальніцкай дзейнасці бібліятэк. Заканадаўча прадугледжаныя формы ініцыятыўнай дзейнасці бібліятэк. Пытанні ліцэнзавання асобных кірункаў дзейнасці бібліятэк.

## *Тэма 1.8. Прававая база фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Асноўныя нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь і іх палажэнні, якія рэгулююць адносіны, узнікаючыя пры камплектаванні бібліятэчнага фонду рознымі відамі тыражаваных дакументаў (друкаваных, электронных выданняў); фарміраванні электронных рэсурсаў (знешніх і лакальных); арганізацыі бібліятэчных інфармацыйных рэсурсаў (улік, забеспячэнне захаванасці, развіццё сістэмы дэпазітарнага захавання); выключэнні дакументаў з ліку інфармацыйных рэсурсаў (фонду) бібліятэкі.

Прававая база набыцця дакументаў і падпіскі на перыядычныя выданні. Заканадаўства аб абавязковым экзэмпляры дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя праваадносіны, якія ўзнікаюць пры арганізацыі бібліятэчнага фонду. Прававое рэгуляванне ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў.

Прававыя асновы выключэння дакументаў з ліку інфармацыйных рэсурсаў (фонду) бібліятэкі і кіравання бібліятэчным фондам.

### *Тэма 1.9. Прававая база абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Асноваўтваральныя нарматыўныя прававыя акты, якія закладваюць прававыя асновы інфармацыйнага, бібліятэчнага, даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў Рэспубліцы Беларусь.

Прававая база забеспячэння канстытуцыйнага права кожнага грамадзяніна на пошук і атрыманне інфармацыі. Выключэнні, якія прапісаны ў заканадаўстве, і звязаны з абмежаваннем доступу да бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк. Прававыя асновы аказання платных і бясплатных паслуг бібліятэкамі. Стан прававой базы абслугоўвання грамадзян з абмежаванымі магчымасцямі, суадносіны беларускага заканадаўства з міжнароднымі нормамі і рэкамендацыямі па гэтаму кірунку прававога рэгулявання.

Прававыя асновы аховы аўтарскіх праў у працэсе абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Прававое рэгуляванне забеспячэння якасці прадукцыі і паслуг, якія рыхтуюцца і аказваюцца бібліятэкамі. Абарона праў карыстальнікаў.

### *Тэма 1.10. Сістэма ўнутрыбібліятэчнай нарматыўна-прававой дакументацыі*

Сістэма лакальных нарматыўна-прававых дакументаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэкі. Спецыяльныя функцыі арганізацыйна-прававых дакументаў бібліятэкі: кіраўнічая, прававая. Асноўныя лакальныя арганізацыйна-прававыя дакументы, якія ўстанаўліваюць статус арганізацыі, яе кампетэнцыю, структуру, функцыянальны змест дзейнасці ўстановы ўвогуле, яе падраздзяленняў і работнікаў, іх правы, абавязкі і інш.

Устаноўчыя дакументы бібліятэкі: статут (палажэнне). Штатны расклад. Правілы ўнутранага працоўнага распарадку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі як дакумент, які адлюстроўвае спецыфіку прымянення норм працоўнага заканадаўства ў канкрэтных умовах. Правілы карыстання бібліятэкай. Палажэнні аб структурных падраздзяленнях бібліятэкі. Палажэнні аб асобных аспектах дзейнасці (платных паслугах, дагаворных адносінах, залогавай практыцы, матэрыяльным стымуляванні супрацоўнікаў і інш.). Інструкцыі. Службовыя інструкцыі супрацоўнікаў. Загады і распараджэнні дырэктара (загадчыка) бібліятэкі. Пастановы (рашэнні) калегіяльных і прадстаўнічых грамадскіх органаў кіравання бібліятэкай.

### *Тэма 1.11. Бібліятэкі і аўтарскае права*

Нарматыўныя прававыя акты, якія складаюць прававую базу аховы аўтарскіх праў. Аб'екты аўтарскага права. Асноўныя палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах», якія датычацца дзейнасці бібліятэк. Прававыя асновы свабоднага выкарыстання бібліятэкамі правамерна апублікаваных твораў як прадуктаў інтэлектуальнай працы, іх мэтавага ўзнаўлення (рэпрадуктавання, электроннага капіравання і інш.) у адпаведным аб'ёме.

Бібліятэка як трымальнік (захавальнік), распаўсюджвальнік (пасрэднік) і стваральнік (вытворца) інтэлектуальнай прадукцыі: асаблівы прававы рэжым дзейнасці. Прававы статус службовага твора.

Прадастаўленне карыстальнікам доступу да знешніх інфармацыйных рэсурсаў з дапамогай Інтэрнэту ў кантэксце палажэнняў заканадаўства аб аўтарскім праве. Асноўныя прававыя праблемы аховы аўтарскіх праў у сферы дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 1.12. Якасць як аб'ект кіравання ў бібліятэцы*

Якасць прадуктаў і паслуг як сучасная тэндэнцыя развіцця грамадства. Паняцце і сутнасць катэгорыі «якасць».

Асаблівасці тэрміналогіі якасці ў бібліятэчнай сферы. Якасць і катэгорыя спажывецкай каштоўнасці. Паняцце бібліятэчна-бібліяграфічнай прадукцыі/паслугі як выніку бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, праблема класіфікацыі бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў/паслуг. Характарыстыка спажыўцоў і зацікаўленых бакоў у якасці бібліятэчна-бібліяграфічных прадуктаў/паслуг. Уласцівасці бібліятэчна-бібліяграфічных паслуг



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і іх уплыў на выбар паказчыкаў, крытэрыяў, метадаў іх ацэнкі. Паняцце канкурэнтаздольнасці бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.

Характарыстыка аб'екта, суб'екта, арганізацыйных структур, функцый і метадаў кіравання якасцю ў бібліятэцы.

### *Тэма 1.13. Сістэма менеджменту якасці ў бібліятэцы: сутнасць і змест*

Паняцце і асноўныя задачы сістэмы менеджменту якасці (СМЯ). Кіраванне якасцю на аснове стандартаў ISO серыі 9000. Прынцыпы менеджменту якасці. Характарыстыка зместу прынцыпаў кіравання якасцю: арыентацыя на спажыўца; лідарства кіраўніка; уцягванне работнікаў; працэсны падыход; сістэмны падыход да менеджменту; пастаяннае паляпшэнне; прыняцце рашэнняў, заснаванае на фактах; узаемавыгадныя адносіны з пастаўшчыкамі.

Асноўныя этапы стварэння і ўкаранення СМЯ ў дзейнасць бібліятэк. Дакументаванне СМЯ. Характарыстыка асноўных відаў дакументацыі СМЯ: Палітыка (місія) бібліятэкі і мэты ў галіне якасці; Кіраўніцтва па якасці; стандарты прадпрыемства; дакументаваныя працэдуры на асноўныя тэхналагічныя працэсы бібліятэкі і дакументаванне асноўных працэдур СМЯ; рабочыя інструкцыі. Маніторынг, вымярэнне і аналіз дзейнасці бібліятэк як састаўная частка ўкаранення і функцыянавання СМЯ ў бібліятэцы. Аўдыт якасці: азначэнне, статус, віды. Самаацэнка дзейнасці бібліятэк: тэхналогія правядзення. Сертыфікацыя сістэм менеджменту якасці.

### *Тэма 1.14. Ацэнка і вымярэнне эфектыўнасці і якасці бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці*

Кваліметрыя як навука аб вымярэнні якасці прадукцыі і паслуг.

Ацэнка дзейнасці бібліятэк у паняццях эфектыўнасці і якасці. Паняцце аб крытэрыях і паказчыках як вымяральніках эфектыўнасці і якасці. Патрабаванні, сфармуляваныя ў міжнародных стандартах, да вызначэння паказчыкаў/ індыкатараў эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк. Віды паказчыкаў якасці па колькасці характарызуемых уласцівасцей (адзінкавыя, комплексныя, адносныя, інтэгральныя). Уяўленне аб сістэме збалансава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных паказчыкаў дзейнасці бібліятэк, якія адлюстроўваюць усе яе аспекты, звязаныя з выдаткамі і вынікамі дзейнасці. Характарыстыка паказчыкаў/індыкатараў эфектыўнасці ў кантэксце рэкамендацый стандарту ISO 11620 (1998; 2014) «Информация и документация. Показатели эффективности деятельности библиотек».

Якасць інфармацыйных прадуктаў і паслуг бібліятэкі: вызначэнне, асноўныя характарыстыкі, паказчыкі.

Метады вывучэння сацыяльнай, эканамічнай, функцыянальнай эфектыўнасці бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў і якасці бібліятэчна-бібліяграфічных прадуктаў і паслуг.

### *Тэма 1.15. Тэхналагічны менеджмент як састаўная частка сістэмы кіравання бібліятэкай*

Тэхналогія: асноўныя падыходы да трактоўкі зместу паняцця, структура. Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент: сутнасць і месца ў сістэме агульнага менеджменту бібліятэкі. Асноўныя аб'екты і суб'екты тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту. Бібліятэчная тэхналогія: сутнасць паняцця, характэрныя асаблівасці.

Значэнне і задачы тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту для функцыянавання бібліятэкі як тэхналагічнай сістэмы. Аналіз бібліятэчных тэхналогій як аснова распрацоўкі тэхналагічнай і структурна-функцыянальнай мадэлі бібліятэкі. Узаемасувязь стратэгічных і інавацыйных напрамкаў развіцця бібліятэкі з тэхналагічнымі рашэннямі. Функцыянаванне бібліятэкі як тэхналагічнай сістэмы.

Асноўныя тэхналагічныя цыклы бібліятэк: фарміраванне фондаў, фарміраванне бібліяграфічных баз даных, абслугоўванне карыстальнікаў і інш. Працэсы і аперацыі як састаўная частка бібліятэчнай тэхналогіі.

### *Тэма 1.16. Нарміраванне бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў*

Нарміраванне бібліятэчнай працы: значэнне, сутнасць і асаблівасці. Нарміраванне бібліятэчных працэсаў як фактар кіравання працоўнымі рэсурсамі. Віды норм. Нормы часу і нормы выпрацоўкі. Тыпавыя нормы часу на бібліятэчныя працэсы. Прычыны стварэння мясцовых (лакальных) норм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патрабаванні да працэсу нарміравання. Характарыстыка этапаў нарміравання: аналіз стану нарміравання працы ў бібліятэцы; падрыхтоўчыя і арганізацыйна-метадычныя работы па правядзенні нарміравання; замеры працоўнага часу; апрацоўка сабраных матэрыялаў і стварэнне нарматываў затрат працы; праверка норм у вытворчых умовах; падрыхтоўка канчатковай рэдакцыі нарматыўных матэрыялаў; укараненне норм.

Метады нарміравання: хронаметраж, фатаграфія (самафатаграфія) працоўнага дня, відэаздымка працоўных працэсаў і інш. Выбар метаду нарміравання бібліятэчных працэсаў. Методыка правядзення, апрацоўкі і карэкціроўкі хронаметражных назіранняў.

Асаблівасці і асноўныя этапы нарміравання бібліятэчных тэхналагічных працэсаў у аўтаматызаваным рэжыме.

### *Тэма 1.17. Тэхналагічная служба бібліятэкі*

Азначэнне паняцця «тэхналагічная служба». Варыянты існавання тэхналагічных службаў бібліятэк: спецыялізаванае структурнае падраздзяленне бібліятэкі, савет тэхнолагаў, аддзелы аўтаматызацыі, якія ажыццяўляюць тэхналагічнае суправаджэнне АБІС і інш.

Структура тэхналагічных службаў. Фактары, якія ўплываюць на іх склад. Асноўныя арганізацыйныя кампаненты.

Характарыстыка асноўных задач тэхналагічных службаў бібліятэк: аперацыйны аналіз тэхналагічных працэсаў; ацэнка нарматыўна-метадычнага забеспячэння тэхналагічных працэсаў; пабудова тэхналагічных маршрутаў; ацэнка рэсурснай базы бібліятэчнай вытворчасці; нарміраванне тэхналагічных працэсаў; ацэнка працаёмкасці бібліятэчнай вытворчасці; калькуляцыя сабекошту інфармацыйных прадуктаў і паслуг; ацэнка якасці прадуктаў і паслуг; кантроль тэхналагічных працэсаў.

Патрабаванні да кампетэнцый тэхнолагаў. Абавязкі менеджара-тэхнолага.

### *Тэма 1.18. Арганізацыйна-тэхналагічная дакументацыя бібліятэкі*

Бібліятэчная арганізацыйна-тэхналагічная дакументацыя: змест паняцця. Сістэма арганізацыйна-тэхналагічнай дакументацыі бібліятэкі, яе значэнне для рацыянальнай арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыццядзейнасці бібліятэкі. Патрабаванні да арганізацыйна-тэхналагічнай дакументацыі бібліятэкі.

Тэхналагічны дакумент: азначэнне паняцця. Асноўныя віды бібліятэчных тэхналагічных дакументаў: блок-схема, маршрутная карта, тэхналагічная карта, тэхналагічная інструкцыя, тэхналагічная ведамасць, тэхналагічны рэгламент, рабочая інструкцыя.

Арганізацыйна-распарадчыя дакументы бібліятэкі: правілы, пратаколы, рашэнні, інструкцыі, загады і акты, палажэнні аб структурных падраздзяленнях, калегіяльных і дарадчых органах бібліятэкі, інструкцыі па асобных відах дзейнасці, памяткі і інш.

Унутраная база дакументаў, рэгламентуючых бібліятэчную тэхналогію: формы і віды дакументаў. Тэрміны дзейнасці тэхналагічнай дакументацыі. Мадэляванне аптымальнага блока рэгламентуючай тэхналагічнай дакументацыі бібліятэкі.

### *Тэма 1.19. Мадэляванне бібліятэчнай тэхналогіі*

Напрамкі ўдасканалення бібліятэчных цыклаў: упарадкаванне існуючай бібліятэчнай тэхналогіі, пошук інавацыйных тэхналагічных рашэнняў, кіраванне працэсамі замены ўстарэлай тэхналогіі і абсталявання.

Этапы распрацоўкі тэхналагічнага працэсу. Аперацыйна-тэхналагічны аналіз тэхналагічных цыклаў бібліятэкі, стварэнне тэхналагічных картатэк. Пабудова імітацыйных мадэляў працэсаў і цыклаў з дапамогай блок-схем. Графічныя метады аналізу: састаўленне мадэлі скразных функцыянальных блок-схем паміж аддзеламі і маршрутных карт. Алгарытм тэхналагічнага маршруту. Распрацоўка тэхналагічных карт. Выкарыстанне тэхналагічных карт для выпрамлення тэхналагічнага працэсу, ліквідацыі лішніх элементаў, дубліравання.

Мадэляванне бібліятэчных працэсаў. Віды мадэлявання ў тэхналагічным бібліятэчным менеджменце: эканоміка-матэматычны, мадэлі сістэмнага аналізу, метады імітацыйнага мадэлявання. Класіфікацыя метадаў імітацыйнага мадэлявання: пазнавальныя, прагнозныя і кіраўнічыя мадэлі.

Афармленне вынікаў тэхналагічнага мадэлявання бібліятэчных працэсаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 1.20. Асноўныя кірункі інавацыйных змен у бібліятэцы*

Фактары і ўмовы ўкаранення інавацый у дзейнасць бібліятэк. Інавацыйная дзейнасць бібліятэк у кантэксце новай грамадскай рэальнасці. Інавацыйная палітыка ў стратэгічным кіраванні бібліятэкай. Змест бібліятэчнай інаватыкі, яе мэты.

Змены зместу, форм, метадаў дзейнасці бібліятэк у кантэксце ўкаранення інавацый. Асноўныя напрамкі ўкаранення інавацый у дзейнасць бібліятэк: сацыяльны, арганізацыйна-кіраўнічы, змястоўна-дзейнасны, тэхналагічны, фінансава-эканамічны. Класіфікацыя бібліятэчных інавацый: існуючыя падыходы і характарыстыка.

### *Тэма 1.21. Дзейнасць метадычных цэнтраў па распаўсюджванні інавацыйнага вопыту*

Інавацыйная дзейнасць у бібліятэках, яе сутнасць і змест. Сутнасныя адрозненні тэрмінаў «інавацыя» і «новаўвядзенне». Мэта інавацыйнай дзейнасці бібліятэк. Асноўныя класы новаўвядзенняў, характэрных для бібліятэчнай практыкі.

Вызначэнне паняцця «кіраванне новаўвядзеннямі». Кіраванне новаўвядзеннямі як эфектыўны сродак удасканалення дзейнасці бібліятэк. Прынцыпы, якія ляжаць у аснове кіравання новаўвядзеннямі.

Характарыстыка асноўных этапаў інавацыйнай дзейнасці метадычных цэнтраў бібліятэк.

Інфармацыйнае забеспячэнне інавацыйнай дзейнасці. Інфармаванне аб новаўвядзеннях. Метады распаўсюджвання новаўвядзенняў.

### *Тэма 1.22. Навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк: сутнасць і асноўныя напрамкі*

Узаемасувязь інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту і навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк. Навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк: азначэнне паняцця, асноўныя мэты і задачы на сучасным этапе. Узроўні навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.

Асноўныя прынцыпы навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Функцыі навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці. Узаемасувязь навукова-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці.

Асноўныя кірункі навукова-метадычнага забеспячэння: аналітычная дзейнасць, кансультатыўна-метадычная дзейнасць, дзейнасць па фарміраванні і садзейнічанні засваення бібліятэчных новаўвядзенняў, павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў.

### *Тэма 1.23. Навукова-інавацыйны патэнцыял аналітычнай дзейнасці бібліятэк. Метадычны маніторынг*

Метадычны маніторынг як сістэма назірання за зменамі ў дзейнасці бібліятэк. Вызначэнне паняцця «метадычны маніторынг». Яго аб'екты і асноўныя крыніцы інфармацыі.

Абследаванне дзейнасці бібліятэк як асноўны метад атрымання інфармацыі. Асноўныя метады абследавання бібліятэк.

Віды абследавання бібліятэк. Мэты і аб'екты франтальнага і тэматычнага абследаванняў. Этапы правядзення абследавання.

Аналіз бібліятэчнай практыкі: аналіз зместу дзейнасці бібліятэк, аналіз метадаў і вынікаў работы. Колькасны і якасны аналіз, іх асноўныя метады.

Сістэматызацыя фактычнага матэрыялу. Выніковыя дакументы аналітычнай дзейнасці: статыстычныя зводкі, заключэнні па справаздачах і планах бібліятэк, агляды дзейнасці бібліятэк. Выкарыстанне вынікаў аналітычнай дзейнасці ў метадычным забеспячэнні работы бібліятэк і ва ўдасканаленні функцыянавання бібліятэкі як сацыяльнага інстытута.

### *Тэма 1.24. Паблік рылейшнз бібліятэк: тэарэтычны аспект*

Тэрміналагічны аналіз асноўных паняццяў паблік рылейшнз. Падыходы да вызначэння паняцця «паблік рылейшнз». ПР-дзейнасць, ПР-тэхналогіі, ПР-стратэгіі бібліятэкі.

Мэты, задачы, прынцыпы паблік рылейшнз бібліятэк.

Упраўленне іміджам бібліятэкі: месца і роля ПР-тэхналогій. Вызначэнне паняццяў і іх сэнсавая розніца – паблісіці, рэпутацыя, прэстыж.

Характарыстыка функцый паблік рылейшнз у бібліятэках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 1.25. ПР-тэхналогіі бібліятэк*

Класіфікацыя ПР-сродкаў. Спонсарства, патранаж, дабрачыннасць. Афіцыйны сайт бібліятэкі як інструмент па фарміраванні ўстойлівай рэпутацыі і ўстанаўлення зваротнай сувязі з карыстальнікамі. Патрабаванні да афармлення сайта. Сістэма архівацыі і пошуку. Сутнасць паняццяў «ПР-інфармацыя», «ПР-камунікацыя», «ПР-тэкст». Жанравая сістэма ПР-тэкстаў: асаблівасці фарміравання і функцыянавання ў бібліятэках. Аператыўна-навінныя жанры: прэс-рэліз, патрабаванні да падрыхтоўкі і распаўсюджвання прэс-рэлізаў. Даследча-навінныя жанры: бэкграўндэр, апытанне. Факталагічныя жанры: факт-ліст, біяграфія. Вобразна-навінныя жанры: віншаванні, лісты, камбінаваныя ПР-тэксты: прэс-кіт, буклет, брашура, лістоўка, ньюслетар. Тэхналогія састаўлення і афармлення ПР-тэкстаў. Медыятэксты: іміджавы артыкул, газетна-часопісныя артыкулы, плакаты, экспазіцыі, аўдыявізуальныя матэрыялы, відэапрэс-рэлізы. Лічбавыя ПР. Магчымасці выкарыстання ў бібліятэках як прамоцыі паслуг. Падрыхтоўка карпаратыўнага выдання бібліятэкі. Яго роля ва ўмацаванні іміджу бібліятэкі.

### *Тэма 1.26. Фарміраванне іміджу бібліятэкі*

Сацыяльная абумоўленасць іміджу бібліятэкі. Вызначэнне паняццяў ідэальнага, люстранога, рэальнага іміджу. Арганізацыя спецыяльных мерапрыемстваў, якія падтрымліваюць імідж бібліятэкі.

Фірменны стыль бібліятэкі як важнейшы элемент яе іміджу. Вызначэнне зместу і элементаў фірменнага стылю. Сэнс знакавых сімвалаў. Выкарыстанне ў бібліятэках выяўленчых, славесных, камбінаваных знакаў. Патрабаванні да іх стварэння.

Характарыстыка кампанентаў фірменнага стылю: фірменнага знака, фірменнага шрыфту, фірменнага лозунга, фірменнага набору колераў, каляровага ці кампазіцыйнага варыянта фірменнага бланка. Набор дзелавой дакументацыі бібліятэкі (фірменны бланк, дзелавы канверт, запрашальны білет, фірменная папка, бэйджы для супрацоўнікаў). Змест рэкламна-інфармацыйных друкаваных матэрыялаў (лістоўкі, буклеты, праспекты, плакаты). Фірменныя сувеніры. Фірменны знак і эмблема як выяўленчыя сімвалы бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уплыў іміджу бібліятэкі на яе статус у грамадстве і грамадскай свядомасці.

### *Тэма 1.27. Развіццё і станаўленне бібліятэчнай рэкламы*

Этапы развіцця і станаўлення бібліятэчнай рэкламы ў краінах Заходняй Еўропы і Расіі. Уплыў на станаўленне бібліятэчнай рэкламы сродкаў масавай інфармацыі. Рэклама Паўночна-Заходняга краю (Беларусь) у кантэксце развіцця дарэвалюцыйнай расійскай рэкламы. Развіццё вербальнай бібліятэчнай рэкламы. Функцыі народных лубкоў і кірмашоў. Рэкламная дзейнасць бібліятэк пры педагагічных таварыствах на тэрыторыі Беларусі.

Фактары стабілізацыі і пашырэння сферы бібліятэчнай рэкламы ў XX ст.

### *Тэма 1.28. Спецыфіка рэкламнай дзейнасці бібліятэк*

Тэарэтычныя асновы рэкламна-інфармацыйнай дзейнасці бібліятэк. Сутнасць, змест, функцыі рэкламнай дзейнасці бібліятэк. Мэты і прынцыпы рэкламнай дзейнасці бібліятэк. Суб’екты і аб’екты бібліятэчнай рэкламы. Канцэпцыя педагагічна мэтанакіраванай рэкламнай дзейнасці бібліятэк. Класіфікацыя сродкаў і форм рэкламы.

Паняцце «рэкламныя тэхналогіі». Эфектыўныя рэкламныя тэхналогіі і іх выкарыстанне ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

Тэхналогіі вытворчасці рэкламнага прадукту. Тэхналогія знешняй і ўнутранай рэкламы бібліятэкі. Тэхналогія стэндавай і постарнай рэкламы бібліятэкі.

Рэкламнае значэнне кніжных выстаў. Функцыі выстаў у кантэксце маркетынгавай камунікацыі. Падрыхтоўка выставы. Распрацоўка бюджэту выставы. Работа са СМІ.

### *Тэма 1.29. Сутнасць, значэнне, задачы, прынцыпы і катэгорыі бібліятэчнай педагогікі*

Бібліятэчная педагогіка як навука. Падыходы да вызначэння паняцця «бібліятэчная педагогіка». Аб’ект і прадмет бібліятэчнай педагогікі. Мэта бібліятэчнай педагогікі. Уяўленні аб задачах бібліятэчнай педагогікі на розных этапах існавання грамадства. Эвалюцыя прынцыпаў бібліятэчнай педагогікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кірункі бібліятэчнай педагогікі: агульнапедагагічны, камунікатыўны, кагнітывісцкі, акмеалагічны і бібліятэрапеўтычны. Тэорыя і практыка кіраўніцтва чытаннем. Педагогіка супрацоўніцтва ва ўмовах бібліятэкі. Рэалізацыя прынцыпаў андрагогікі ў бібліятэчным абслугоўванні карыстальнікаў. Катэгорыі бібліятэчнай педагогікі: кіраўніцтва чытаннем, фарміраванне культуры чытання, чытацкае развіццё асобы, чытацкая свядомасць, чытацкая дзейнасць, чытацкія зносіны, інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе бібліятэкі.

### *Тэма 1.30. Сутнасць, спецыфіка і педагагічная накіраванасць прафесійных зносін бібліятэкара*

Паняцце «бібліятэчныя зносіны». Спецыфіка бібліятэчных зносін у параўнанні з іншымі відамі зносін. Структура зносін, іх перцэптыўны, камунікатыўны і інтэрактыўны аспекты. Праявы кожнага з аспектаў у бібліятэчных зносінах. Камунікатыўная прырода чытання, роля зносін у яго арганізацыі і забеспячэнні на розных этапах: у перадкамунікатыўнай, камунікатыўнай і посткамунікатыўнай фазах. Віды і формы бібліятэчных зносін. Непасрэдныя і апасродкаваныя бібліятэчныя зносіны. Фармальна-ролевыя, маніпулятыўныя і гуманістычныя зносіны. Суб’ект-суб’ектныя і суб’ект-аб’ектныя зносіны. Змястоўныя і згорнутыя зносіны. Індывідуальныя, групавыя і масавыя зносіны. Сацыяльна-педагагічныя аспекты бібліятэчных зносін.

### *Тэма 1.31. Прафілактыка і ліквідацыя канфліктных сітуацый у бібліятэчных зносінах*

Бібліятэчная канфліктагогія: мэта, задачы, прынцыпы. Тыповыя падставы для канфліктаў ва ўмовах бібліятэчнага абслугоўвання. Адметныя рысы канфліктнай сітуацыі. Псіхалагічная прырода канфліктнасці. Канфліктагены і іх роля ва ўзнікненні канфлікту. Тыпы канфліктагенаў і спосабы рэагавання на іх з мэтай прадухілення канфлікту. Эскалацыя канфлікту і як яе пазбегнуць. Крокі, накіраваныя на аслабленне псіхалагічнага прэсінгу з боку чытача. Правілы паводзін бібліятэкара ў выпадку прад’яўлення чытачом ультыматыўных патрабаванняў. Правілы рацыянальных паводзін у канфлікце з чытачом. Паводзіны, якіх трэба пазбягаць у канфлікце. Тыпы канфліктных асоб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і спосабы іх нейтралізацыі. Спосабы выйсця з канфлікту. Цана канфлікту. Ліквідацыя вынікаў канфлікту.

Канфлікты ў бібліятэчным калектыве і іх адмоўны ўплыў на якасць абслугоўвання. Віды вытворчых канфліктаў і асаблівасці іх уплыву на бібліятэчныя зносіны, спосабы прафілактыкі і пераадолення.

### *Тэма 1.32. Тэарэтыка-метадычныя падыходы да вывучэння чытача ў бібліятэках*

Мэта, задачы і прынцыпы сацыялогіі чытання і бібліятэчнай сацыялогіі. Праграма сацыялагічнага даследавання чытання як асноўны метадычны дакумент. Метадалагічны і працэдурны раздзелы праграмы. Вызначэнне праблемы і праблемнай сітуацыі як падставы для правядзення даследавання. Аб'ект, прадмет, мэта і задачы ў сацыялагічным даследаванні чытання. Інтэрпрэтацыя і аперацыяналізацыя ключавых паняццяў у сацыялагічным даследаванні чытання. Рабочыя гіпотэзы ў даследаванні чытання: віды і значэнне. Сістэмны аналіз аб'екта даследавання. Генеральная і выбарачная сукупнасць, прынцыпы выбаркі і іх ужыванне ў сацыялагічных даследаваннях чытання ў Беларусі. Выпадковая і квотная выбаркі: магчымасці выкарыстання ва ўмовах бібліятэкі. Рэпрэзентатыўнасць даследавання.

### *Тэма 1.33. Суб'екты сацыякультурнай дзейнасці*

Шматзначнасць паняцця «суб'екты сацыякультурнай дзейнасці». Структура і класіфікацыя суб'ектаў сацыякультурнай дзейнасці. Іх узаемадзеянне ў працэсе рэалізацыі сацыяльна-культурнай палітыкі, якая здзяйсняецца на дзяржаўным, недзяржаўным, сямейным узроўнях.

Асоба як суб'ект сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Прыярытэт творчай індывідуалізацыі асобы ў сферы дасугу.

Сацыяльна-культурныя інстытуты, разнастайныя падыходы да пабудовы іх тыпалогіі. Класіфікацыя сацыяльна-культурных інстытутаў у залежнасці ад іх ролевай функцыі адносна спажыўцоў культурных патрэб, каштоўнасцей і паслуг. Бібліятэка ў сістэме сацыякультурных інстытутаў. Сям'я як сацыякультурны інстытут. Адметнасці і праблемы сямейнага дасугу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі. Функцыі сродкаў масавай інфармацыі як сацыякультурнага інстытута. Галіновыя ўстановы сацыякультурнага профілю, іх структура.

Сацыякультурныя супольнасці і фарміраванні, іх тыпалогія. Сістэма грамадскіх фарміраванняў, арганізацый, фондаў, рухаў і іншых інстытутаў як асяроддзе, якое садзейнічае сацыяльна-культурнай актыўнасці людзей у сферы дасугу.

### *Тэма 1.34. Тэарэтыка-арганізацыйныя асновы сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк*

Асаблівасці тэхналогій сацыякультурнай дзейнасці. Масавыя, групавыя і індывідуальныя формы сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк, методыкі іх рэалізацыі. Культурна-дасугавая праграма бібліятэкі як форма мастацкага мадэлявання асяроддзя. Агульная характарыстыка сродкаў сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Тыпавыя методыкі сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк, іх характарыстыка (інфармацыйна-асветніцкая, мастацка-публіцыстычная, культурна-забаўляльная дзейнасць).

Праектныя тэхналогіі ў сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Аналіз сацыякультурнай сітуацыі як частка праектнай тэхналогіі ў сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Праекты і праграмы бібліятэк гісторыка-культурнай накіраванасці, у галіне мастацкай культуры, духоўна-маральнай і сацыяльна-псіхалагічнай культуры, экалагічнай культуры, палітычнай культуры, прафесійнай культуры, фізічнай і псіхічнай культуры.

Кіраўнічы цыкл у тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 1.35. Пастаноўка культурна-дасугавых праграм у бібліятэках*

Шматфункцыянальнасць працы бібліятэкара падчас падрыхтоўкі культурна-дасугавых праграм. Тыпы вядучых культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Моўная культура вядучага культурна-дасугавай праграмы бібліятэкі.

Сцэнарна-рэжысёрскія тэхналогіі ў сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Сцэнарый і сцэнарны план як асноўныя віды драматургіі ў бібліятэцы. Этапы падрыхтоўкі сцэнарыя. Прыёмы мантажу ў сцэнарыі культурна-дасугавай праграмы. Рэжы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сура культурна-дасугавых праграм у бібліятэках. Этапы рэпетыцыйнага працэсу.

Мастацкае афармленне культурна-дасугавай праграмы. Асновы афармлення друкаванай прадукцыі (афішы, запрашэнні) да культурна-забаўляльных праграм бібліятэк. Музычнае афармленне культурна-дасугавых праграм бібліятэк.

### *Тэма 1.36. Педагагічныя кампаненты бібліяграфічнай дзейнасці*

Фарміраванне псіхолага-педагагічнай канцэпцыі бібліяграфіі (60–80-я гг. ХХ ст.). Уклад Ю. М. Тугава, С. А. Трубнікава, Ю. С. Зубава ў распрацоўку псіхалагічных, чытачазнаўчых, бібліятэчна-псіхолага-педагагічных пытанняў функцыянавання бібліяграфіі. Напрамкі рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліяграфічныя зносіны ў сістэме бібліятэчных камунікацый.

Педагагічныя аспекты бібліяграфічнага абслугоўвання: дыдактычныя ўмовы, прынцыпы і методыкі. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў як кагнітыўны працэс: змест, прынцыпы, метадычныя патрабаванні, напрамкі.

### *Тэма 1.37. Рэкамендацыйная бібліяграфічная дзейнасць у падтрымцы і развіцці чытання*

Рэкамендацыйная бібліяграфія: вызначэнне і грамадскае прызначэнне. Развіццё рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў розныя гістарычныя перыяды. Прынцыпы рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў падтрымцы і развіцці чытання. Асноўныя віды і жанры рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў. Напрамкі выкарыстання рэкамендацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці ў рабоце бібліятэк. Сучасны стан падрыхтоўкі і выдання крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў Рэспубліцы Беларусь.

Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі ў адпаведнасці з асноўнымі працэсамі бібліяграфавання. Характарыстыка метадычных асаблівасцей падрыхтоўкі асобных тыпаў рэкамендацыйных бібліяграфічных крыніц. Характарыстыка метадычных асаблівасцей падрыхтоўкі асобных жанраў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 1.38. Эканамічныя адносіны ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

Бібліятэчная справа – падгаліна грамадскага сектара эканомікі. Эканоміка бібліятэчнай справы як састаўная частка эканомікі культуры. Эканамічныя функцыі і сувязі бібліятэчнай справы. Вызначэнне і суадносіны паняццяў «эканоміка бібліятэчнай справы» і «эканоміка бібліятэчнай дзейнасці». Прадмет, аб'ект і метады вывучэння эканомікі бібліятэчнай справы. Мэты бібліятэчнай эканамічнай навукі. Мікра- і макраўзроўні эканамічных адносін у бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, іх спецыфіка: адносіны з нагоды ўласнасці, грамадскага падзелу працы, адукацыі і выкарыстання рэсурсных фондаў, узнаўлення і інш. Інфармацыйныя рэсурсы і патрэбы, метаінфармацыйны прадукт, інфармацыйна-аналітычная дзейнасць – аб'екты таварна-грашовых зносін у бібліятэчнай справе.

Эканоміка бібліятэчнай справы як галіна навуковых даследаванняў і прыкладных распрацовак, іх напрамкі.

### *Тэма 1.39. Фінансавае забеспячэнне функцыянавання бібліятэкі*

Фінансавы механізм бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці: крытэрыі вызначэння прыярытэтных кірункаў фінансавання, сацыяльнай і эканамічнай эфектыўнасці; мадэлі рэсурснага забеспячэння; дзяржаўна-прыватнае інавацыйнае развіццё і сеткавае ўзаемадзеянне. Вызначэнне паняццяў «фінансаванне бібліятэк», «фінансавыя рэсурсы».

Крыніцы і прынцыпы фінансавання бібліятэк. Рэспубліканскі, рэгіянальны, ведамасны ўзроўні бюджэтных паступленняў. Асаблівасці фінансавання бібліятэк з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Фінансавыя сродкі заснавальнікаў бібліятэк. Бюджэты дзяржаўных, камерцыйных і грамадскіх прадпрыемстваў і арганізацый як крыніцы фінансавання бібліятэк. Асаблівасці фінансавання бібліятэк сродкамі фандрэйзінгу. Мэтавае фінансаванне сацыяльна значных бібліятэчных праграм і праектаў. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці ў структуры бюджэту бібліятэкі.

Адзіны фонд фінансавых сродкаў бібліятэкі і яго размеркаванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фінансавая дакументацыя бібліятэкі: каштарыс, бізнес-план паслуг, дамовы, кантракты, палажэнні, акты і рахункі набыцця і спісання маёмасці.

### *Тэма 1.40. Ініцыятыўная гаспадарча-эканамічная дзейнасць бібліятэкі*

Вызначэнне паняцця «ініцыятыўная дзейнасць бібліятэкі». Варыянты ініцыятыўных напрамкаў бібліятэчнай работы, іх сацыяльна-эканамічнае абгрунтаванне з улікам існуючай прававой прасторы, бібліятэчнай макраэканамічнай і знешняга рынкавага асяроддзя.

Вызначэнне паняцця «гаспадарчая дзейнасць бібліятэк». Асноўныя аб'екты гаспадарчай дзейнасці бібліятэк: маёмасць, фінансавыя сродкі, інтэлектуальныя прадукты і працоўныя рэсурсы. Змест гаспадарчай дзейнасці бібліятэк. Фінансавыя, працоўныя і камерцыйныя адносіны ў сістэме гаспадарчай дзейнасці бібліятэк. Узроўні рэгулявання фінансавых, працоўных і камерцыйных адносін у бібліятэках. Суадносіны гаспадарчай дзейнасці бібліятэк з грамадскім сектарам і камерцыйнай сферай.

Вызначэнне паняцця «гаспадарчы механізм». Прынцыпы гаспадарчага механізма бібліятэк. Задачы гаспадарчага механізма ў бібліятэчнай справе. Вызначэнне паняцця «гаспадарчы разлік». Сутнасць гаспадарчага разліку ў дзейнасці бібліятэчных устаноў.

Паказчыкі эфектыўнасці гаспадарчай дзейнасці бібліятэк: прыбытак, сабекошт бібліятэчнай прадукцыі.

### *Тэма 1.41. Гаспадарча-дагаворныя адносіны з удзелам бібліятэкі*

Паняцце «дагаворныя (дагаворна-прававыя) адносіны ва ўмовах бібліятэкі». Прававая рэгламентацыя грамадзянска-прававых дагавораў.

Гаспадарчы дагавор. Тыповая структура гаспадарчага дагавора.

Віды дамоўных адносін (дагаворы куплі-продажу; дагаворы падраду; дагаворы аб сумеснай дзейнасці; асаблівыя віды дагавораў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізацыйна-тэхналагічныя асаблівасці складання дамовы куплі-продажу – паслуг і прадукцыі; канкрэтных правоў; арэндныя.

Методыка складання дамовы падраду – на стварэнне і перадачу інтэлектуальнага прадукту (паслуг/прадукцыі); аб інфармацыйна-кансалтынгавым і іншым абслугоўванні; на рэкламу паслуг/прадукцыі або віду дзейнасці.

Методыка складання дамовы аб сумеснай дзейнасці.

Структура і тэхналогія стварэння асаблівых відаў дамоў – пра дабрачыннае рэсурснае забеспячэнне (дарэнні/ахвяраванні) і інш.

### *Тэма 1.42. Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе*

Бібліятэка як сацыяльна-эканамічная сістэма: характарыстыка асноўных падсістэм і элементаў. Вызначэнне паняццяў «нормы» і «нарматывы». Нормы як сродак рэгулявання дзейнасці бібліятэк. Віды норм (нормы абслугоўвання, сеткавыя нормы, рэсурсныя нормы, нормы эфектыўнасці). Адзінкі вымярэння норм. Адзінкі выражэння норм. Характарыстыка асноўных груп норм: мінімальныя, аптымальныя, максімальныя, дыферэнцыраваныя. Метады вызначэння норм: эмпірычны, навуковага мадэлявання, метад запазычання. Роля дзяржаўных органаў улады ў вызначэнні норм. Значэнне норм для эканомікі бібліятэчнай справы.

Інструктыўна-нарматыўная дакументацыя як аснова нарміравання. Нарміраванне тэхналагічных аперацый у бібліятэках: асноўныя падыходы.

Паняцце «бібліятэчная эканаметрыя». Эканаметрычныя мадэлі як сродак распрацоўкі нарматываў у бібліятэчнай справе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы

### *Тэма 2.1. Прынцыпы пабудовы АБІС*

Аналіз існуючых поглядаў на прынцыпы пабудовы аўтаматызаваных сістэм. Базавыя прынцыпы распрацоўкі новых, удасканалення функцыянуючых ці ўкаранення ўжо існуючых АБІС. Прынцып ідэнтычнасці і яго рэалізацыя ў тыпізацыі праектных рашэнняў. Прынцып перыймальнасці. Адкрытасць АБІС. Прынцып інтэграванасці і яго праяўленне ў аднаразавай апрацоўцы інфармацыі, карпаратыўнасці і сеткавай інтэграцыі. Прынцып сумяшчальнасці. Апаратная (тэхнічная), інфармацыйная і праграмная сумяшчальнасць у АБІС. Прынцып адаптыўнасці. Пашырэнне, маштабіруемасць і мабільнасць (гнуткасць) АБІС. Прынцып кіравання і маніторынгу.

### *Тэма 2.2. Жыццёвы цыкл АБІС*

Паняцце жыццёвага цыкла аўтаматызаваных сістэм. Комплекс дзяржаўных стандартаў на аўтаматызаваныя сістэмы. Стадыі і этапы іх стварэння і ўкаранення.

Праектаванне АБІС. Фарміраванне патрабаванняў да будучай сістэмы. Перадпраектнае даследаванне бібліятэкі як аб’екта аўтаматызацыі. Распрацоўка канцэпцыі АБІС. Распрацоўка тэхнічнага задання. Эскізнае праектаванне. Тэхнічнае праектаванне. Рабочае праектаванне і распрацоўка рабочай дакументацыі.

Увод АБІС у дзеянне. Падрыхтоўка бібліятэкі да ўводу сістэмы ў дзеянне. Падрыхтоўка персаналу. Камплектацыя сістэмы праграмна-тэхнічным комплексам і інфармацыйна-лінгвістычным забеспячэннем. Мантажныя работы. Пуска-наладачныя работы. Правядзенне папярэдніх выпрабаванняў. Правядзенне вопытнай эксплуатацыі. Прыёмачныя іспыты.

Суправаджэнне АБІС. Выкананне работ у адпаведнасці з гарантыйнымі абавязкамі. Паслягарантыйнае абслугоўванне.

Адміністрыраванне АБІС. Санкцыянаванне доступу і абарона інфармацыі ў сістэме.

Змена пакалення АБІС у бібліятэцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2.3. Рынак АБІС*

Праграмнае забеспячэнне АБІС як сегмент інфармацыйнага рынку. Структура сусветнага рынку АБІС. Пастаўшчыкі сістэм. Пасрэднікі. Умовы паставак. Цанавая палітыка.

АБІС эканамічна развітых краін свету, дзяржаў СНД. АБІС Беларусі.

Праблема выбару АБІС. Методыка вывучэння рынку АБІС. Працэдура выбару сістэмы. Фарміраванне пераліку патрабаванняў да АБІС. Ацэнка рэальных патрэб і магчымасцей бібліятэкі пры выбары АБІС. Формы даследавання рынку АБІС. Вывучэнне «жыццяздольнасці» распрацоўшчыка (пастаўшчыка) сістэмы, гарантыі.

### *Тэма 2.4. Паняцце і структура бібліятэчных камп'ютарных сетак*

Паняцце камп'ютарнай сеткі. Мэты стварэння камп'ютарных сетак бібліятэк.

Асноўныя кампаненты камп'ютарнай сеткі. Камп'ютарная сетка як сукупнасць рабочых станцый, сервераў, перыферыйнага і камунікацыйнага абсталявання, каналаў і сродкаў перадачы даных, аперацыйных сістэм і сеткавых дадаткаў. Паняцце «раздзяленне рэсурсаў» камп'ютарнай сеткі.

Лакальныя, тэрытарыяльныя, ведамасныя, карпаратыўныя і глабальныя бібліятэчныя камп'ютарныя сеткі.

Штучныя і рэальныя сеткі. Хуткасць перадачы інфармацыі. Тып каналу перадачы інфармацыі. Тапалогія. Паняцце аднарангавых і іерархічных сетак. Паняцці «серверы» і «кліенты».

Патрабаванні да сучасных бібліятэчных камп'ютарных сетак.

### *Тэма 2.5. Каналы і фізічнае асяроддзе перадачы даных у камп'ютарных сетках*

Тэхналогія камутацыі каналаў як асноўны прынцып функцыянавання сетак. Камутацыя пакетаў: перавагі і недахопы.

Правадныя і бесправадныя лініі сувязі. Прапускная здольнасць камп'ютарнай сеткі. Пратаколы перадачы даных.

Кабелі и сеткавае абсталяванне. Тыпы кабеляў. Сеткавыя ўстройствы: канцэнтратары, камутатары, паўтарыцелі, маршру-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тызатары, масты, шлюзы і інш. Іх функцыянальнае прызначэнне і асноўныя характарыстыкі. Сеткавыя адаптары.

### *Тэма 2.6. Архітэктура камп'ютарных сетак*

Паняцце архітэктуры камп'ютарных сетак.

Эталонная мадэль OSI як шматузроўневая архітэктура ўзаемадзеяння адкрытых камп'ютарных сістэм. Фізічны, канальны, сеткавы, транспартны, сеансавы, прадстаўнічы і прыкладны ўзроўні OSI. Віды паслуг на кожным з узроўняў, іх узаемадзеянне.

Мадэль IEEE Progect 802 як стандарт для фізічных кампанентаў камп'ютарнай сеткі.

Асаблівасці архітэктуры аднарангавых сетак і сетак тыпу «кліент – сервер». Іх перавагі і недахопы.

Асаблівасці архітэктуры сетак тыпу Ethernet, Token Ring, ArCNET, FDDI.

### *Тэма 2.7. Тапалогіі камп'ютарных сетак*

Вызначэнне, віды і прызначэнне базавых тапалогій камп'ютарных сетак.

Характарыстыка сеткі з «шыннай» тапалогіяй. Асаблівасці канфігурацыі сеткі з «кальцавой» тапалогіяй. Сетка з «зоркавай» тапалогіяй. Спосаб арганізацыі сеткі з «ячэістай» тапалогіяй. Прынцыпы пабудовы сетак з камбінаванымі тапалогіямі.

Перавагі і недахопы сеткавых тапалогій.

Апаратныя сродкі і камунікацыйныя пратаколы сеткавых тапалогій. Стэкі пратаколаў.

### *Тэма 2.8. Карпаратыўныя бібліятэчныя камп'ютарныя сеткі*

Паняцце карпаратыўных (размеркаваных) бібліятэчных камп'ютарных сетак (КБКС).

КБКС тыпу Internet.

Пратаколы перадачы даных у КБКС. Пратакол Z39.50.

Функцыянаванне АБІС у карпаратыўным рэжыме работы. Тэхналогія карпаратыўнай каталагізацыі і рэтраканверсіі каталогаў, электроннай дастаўкі дакументаў, экспарту/імпарту інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зводны электронны каталог як адна з асноўных падсістэм КБКС.

Карпаратыўныя бібліятэчныя камп’ютарныя сеткі далёкага і блізкага замежжа і краін СНД.

Карпаратыўныя бібліятэчныя сеткі ў Беларусі.

Кансорцыумы як арганізацыйная структура КБКС. Класіфікацыя бібліятэчных кансорцыумаў. Тэхналогія стварэння кансорцыума.

### *Тэма 2.9. Інтэрнэт-тэхналогіі як сродак функцыянавання бібліятэчных камп’ютарных сетак*

Структура сеткі Інтэрнэт. Выдзеленыя каналы, камутацыя каналаў, камутацыя пакетаў, пратаколы маршрутызацыі.

Гіпертэкставая тэхналогія WWW. Тэхналогія аддаленага доступу, асноўныя кампаненты падключэння. Тэхналогія сетак ATM.

Сэрвісы Інтэрнэту. Спосабы перадачы файлаў. Спецыфіка пошуку ў «пошукавых машынах» Інтэрнэту. Асноўныя службы (сэрвісы) Інтэрнэту: электронная пошта, дошкі аб’яў, спіскі рассылкі, інтэрнэт-канферэнцыі, вэбінары, інтэрнэт-тэлефанія і інш. Іх выкарыстанне ў рабоце бібліятэкі.

### *Тэма 2.10. IP-адрасы і асноўныя пратаколы Internet*

Сеткавы IP-адрас як унікальны ідэнтыфікатар камп’ютара: класы IP-адраса. Паняцце і структура даменных імён. Асаблівасці даменных імён. Фармат IP-адраса.

Пратаколы і прынцыпы маршрутызацыі Інтэрнэту. Размеркавальныя і цэнтралізаваныя пратаколы маршрутызацыі. Пратакол HTTP для перадачы гіпертэксту. Стэк пратаколаў TCP/IP. Пратакол перадачы файлаў FTP. Стандартныя пратаколы абмену электроннай поштай SMTP, POP 3 і IMAP: асаблівасці іх выкарыстання і перавагі. Пратакол аддаленага доступу TELNET.

### *Тэма 2.11. Інфармацыйная бяспека бібліятэчных камп’ютарных сетак*

Паняцці інфармацыйнай бяспекі камп’ютарных сетак. Міжнародны стандарт бяспекі інфармацыйных сістэм ISO 17799.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя пагрозы бяспецы камп'ютарных сетак: парушэнне канфідэнцыяльнасці інфармацыі, пагрозы парушэння цэласнасці інфармацыі, пагрозы парушэння працаздольнасці сістэмы (адказы ў абслугоўванні), пагрозы несанкцыянаванага доступу. Камп'ютарныя вірусы.

Метады і сродкі забеспячэння інфармацыйнай бяспекі бібліятэчных камп'ютарных сетак. Сродкі антывіруснай абароны, брандмаўэры, сродкі выяўлення камп'ютарных атак.

Праграмнае забеспячэнне абароны інфармацыйных рэсурсаў у камп'ютарных сетках. Характарыстыка антывірусных праграм.

### *Тэма 2.12. Асновы тэорыі баз даных*

Вызначэнне асноўных паняццяў: інфармацыя, даныя, база даных, сістэма кіравання базамі даных, прадметная вобласць, банк даных, дадаткі сістэмы кіравання базамі даных, знешнія дадаткі. Дэцэнтралізаваны і цэнтралізаваны падыходы да арганізацыі даных. Перавагі і недахопы такіх падыходаў.

Базы даных як аснова АБІС.

Банк даных (БнД) як інфармацыйная сістэма. Склад банка даных у вузкім і шырокім сэнсе. Склад банка даных як аўтаматызаванай сістэмы. Кампаненты банка даных. Адметныя асаблівасці БнД. Класіфікацыя БнД.

База даных (БД) як інтэграваны рэсурс. Аб'екты і ўласцівасці БД. Адметныя асаблівасці БД. Трохузроўневая архітэктура БД.

Асноўныя прыметы класіфікацыі БД. Дакументальныя БД, іх віды. Лексікаграфічныя і фактаграфічныя БД. Інтэграваныя і размеркаваныя БД: асноўныя характарыстыкі.

Асноўныя катэгорыі карыстальнікаў БД.

### *Тэма 2.13. Мадэлі даных*

Катэгорыі «даныя» і «мадэль даных». Мадэль даных – ядро базы даных. Класіфікацыя мадэляў даных. Фізічныя мадэлі. Інфалагічныя мадэлі. Даталагічныя мадэлі. Тэзаўрусныя, дэскрыптарныя мадэлі і мадэлі, заснаваныя на мовах разметкі дакументаў, як разнавіднасці дакументальных мадэляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класічныя мадэлі даных: іерархічная, сеткавая, рэляцыйная. Формы прадстаўлення і асноўныя паняцці іерархічнай, сеткавай і рэляцыйнай мадэляў.

Пострэляцыйная мадэль. Асаблівасці прадстаўлення даных з дапамогай пострэляцыйнай мадэлі. Шматмерная і аб'ектна-арыентаваная мадэлі. Асаблівасці прадстаўлення даных з дапамогай шматмернай і аб'ектна-арыентаванай мадэляў. Аб'ектна-рэляцыйная мадэль як новы від мадэлі даных.

Перавагі і недахопы іерархічнай, сеткавай, рэляцыйнай, пострэляцыйнай, шматмернай і аб'ектна-арыентаванай мадэляў даных.

Прыклады СКБД, якія падтрымліваюць розныя віды мадэляў даных.

### *Тэма 2.14. Сістэмы кіравання базамі даных*

Паняцце сістэмы кіравання базамі даных (СКБД). Мовы СКБД. Функцыі СКБД. Патрабаванні да СКБД. Праграмныя кампаненты (модулі) СКБД: працэсар запытаў, кантролер БД, кантролер файлаў і інш. Тыпы зваротаў да СКБД: запыты, мадыфікацыі, мадыфікацыі схемы. Прыметы класіфікацыі СКБД: ступень універсальнасці, функцыянальнасць, мова звароту і інш. Рэляцыйныя СКБД. Кліент-серверныя і файл-серверныя СКБД. Аб'ектна-арыентаваныя СКБД. Мадэль аддаленага доступу да даных. Мадэль сервера баз даных. Сервер дадаткаў. Магчымасці сучасных СКБД. Інтэрфейсы, якія прадастаўляюць СКБД карыстальнікам. Працэс праходжання карыстальніцкага запыту на звесткі з БД.

Асаблівасці функцыянавання, прымянення і выкарыстання СКБД Microsoft Access, Microsoft FoxPro для Windows, Microsoft Visual FoxPro, Borland dBase IV, Oracle, MySQL, MS SQL Server.

### *Тэма 2.15. Асновы праектавання баз даных*

Асноўная мэта і задачы працэсу праектавання БД. Патрабаванні да праекта БД. Функцыі і задачы адміністратара БД у працэсе праектавання БД.

Этапы жыццёвага цыкла базы даных: папярэдняе планаванне; праверка здзяйсняльнасці; вызначэнне патрабаванняў і інш. Галоўныя задачы кожнага этапу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Этапы праектавання базы даных. Фармулёўка і аналіз патрабаванняў. Канцэптуальнае праектаванне і яго працэдуры.

Мадэль «сутнасць – сувязь» (ER-мадэль) як сродак мадэлявання прадметнай вобласці. Асноўныя паняцці ER-дыяграмы. ER-дыяграма сувязі 1:1. ER-дыяграма сувязі 1:М. ER-дыяграма сувязі M:N.

Лагічнае праектаванне і яго працэдуры.

Пераўтварэнне ER-мадэлі ў рэляцыйную мадэль. Правілы фарміравання набору папярэдніх табліц з ER-дыяграм. Нармалізацыя табліц. Прывядзенне табліцы да форм 1НФ, 2НФ, 3НФ. Нармальная форма Бойса-Кода (НФБК), 4НФ, 5НФ і інш.

Фізічнае праектаванне і яго працэдуры.

### *Тэма 2.16. Асновы структураванай мовы запытаў SQL*

Мова SQL: паняцце, прызначэнне, стандарты, перавагі і недахопы. Функцыянальныя магчымасці мовы SQL. Месца мовы SQL у распрацоўцы інфармацыйных сістэм, арганізаваных на аснове тэхналогіі кліент-сервер. Віды мовы SQL: інтэрактыўная і ўкладзеная.

Асноўныя катэгорыі каманд мовы SQL.

Функцыі і асноўныя каманды DDL. Функцыі і каманды DML. Функцыі DQL і яго каманда SELECT. Агульная структура каманды SELECT. Функцыі і каманды DCL. Функцыі і каманды TPL. Функцыі і каманды CCL.

Структура каманды мовы SQL: ключавое слова і сказы. Асноўныя сказы мовы SQL. Тыпы даных мовы SQL, вызначаныя стандартам: Знакавы, Бітавы, Дакладныя лічбы, Акругленыя лічбы, Дата/час, Інтэрвал. Спецыяльныя сімвалы і знакі пунктуацыі SQL. Прэдыкаты.

Тыпы запытаў у мове SQL. Стварэнне розных відаў запытаў у мове SQL. Аптымізацыя SQL-запытаў.

### *Тэма 2.17. Абарона баз даных*

Паняцце абароны БД. Аб’екты БД, якія падлягаюць абароне: табліцы, прадстаўленні, захоўваемыя працэдуры і трыгеры. Правы доступу для кожнага тыпу аб’ектаў.

Сродкі абароны БД у розных СКБД: асноўныя і дадатковыя. Пагрозы бяспекі БД: агульныя і спецыфічныя. Патрабаванні бяспекі БД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульная класіфікацыя ўзроўняў бяспекі. Чатыры класы бяспекі ў адпаведнасці з «Крытэрыямі вызначэння бяспекі камп'ютарных сістэм»: D, C, B і A.

Прынцыпы забеспячэння бяспекі БД: праверка паўнамоцтваў і праверка сапраўднасці (аўтэнтыфікацыя). Іерархічны характар сістэмы прызначэння паўнамоцтваў. Сістэмны адміністратар або адміністратар сервера БД як вышэйшы ўзровень сістэмы прызначэння паўнамоцтваў.

Праграмныя рашэнні для абароны БД: FortiDB; SafeNet DataSecure; McAfee Database Security; Secret Disk Server NG і інш. Шкоднасныя праграмы і іх класіфікацыя. Загрузачныя і файлавыя вірусы, праграмы-закладкі. Метады выяўлення і выдалення вірусаў.

Прававое рэгуляванне аховы БД. БД як асобы аб'ект аўтарскага права. Змест аўтарскіх праў у дачыненні да БД. Абарона праў стваральнікаў БД сродкамі аўтарскага права.

### *Тэма 2.18. Агульныя звесткі аб праграмаванні*

Праграмы і мовы праграмавання.

Этапы выканання праграмы на ЭВМ.

Зыходны код праграмы. Аб'ектны код праграмы. Спосабы трансляцыі. Кампілятары і інтэрпрэтатары.

Крос-платформеннасць праграмных сродкаў.

Паняцце сістэмы праграмавання. Інтэграванае інструментальнае асяроддзе для распрацоўкі праграм.

Асновы web-праграмавання.

### *Тэма 2.19. Мовы праграмавання*

Гісторыя развіцця моў праграмавання. Класіфікацыя моў праграмавання.

Працэдурнае праграмаванне. Аб'ектна-арыентаванае праграмаванне.

Складаючыя мовы праграмавання: алфавіт, сінтаксіс, семантыка.

Паняцце тыпу даных. Канстанты і пераменныя.

Структураваныя тыпы даных (масівы, радкі, запіс).

Структура праграмы на мове высокага ўзроўню.

Модульны падыход да стварэння праграм.

Асновы праграмавання на PHP.

Асновы праграмнай інжынерыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2.20. Асновы распрацоўкі алгарытмаў*

Матэматычныя асновы тэорыі алгарытмаў.

Асноўныя задачы алгарытмізацыі.

Паняцце алгарытму. Выканаўца і ўласцівасці алгарытму.

Спосабы апісання алгарытмаў: слоўны запіс алгарытму, блок-схема (схема графічных сімвалаў), алгарытмічныя мовы.

Парадак выканання алгарытму. Асноўныя віды алгарытмаў: лінейныя, разгалінаваныя і цыклічныя алгарытмы.

Асноўныя прыёмы алгарытмізацыі.

Прымяненне алгарытмаў у бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

### *Тэма 2.21. Асновы аб’ектна-арыентаванага праграмавання*

Элементы аб’ектнай мадэлі: паняцце абстрагавання, паняцце інкапсуляцыі, іерархія аб’ектаў.

Асноўныя прынцыпы аб’ектна-арыентаванага праграмавання (ААП).

Базавыя паняцці ААП. Класы і метады. Аб’екты і іх уласцівасці, метады і падзеі.

Клас як асноўны механізм абстрагавання. Структура і арганізацыя класа. Кіраванне доступу да членаў класа.

Адносіны класаў: абагульненне, асацыяцыя, залежнасць, рэалізацыя. Наследаванне як асноўная форма адносін абагульнення.

Аб’екты класаў і полімарфізм. Іерархія класаў і модулі.

Спецыфікацыя і рэалізацыя класа. Канструктар класа. Ініцыялізацыя палёў аб’ектаў. Канструктар класа. Інтэрфейсы класа. Віртуальныя класы.

Асновы праграмавання на JavaScript.

### *Тэма 2.22. Віды праграмнага забеспячэння АБІС*

Распаўсюджаныя аперацыйныя сістэмы, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС.

Аперацыйныя сістэмы сямейства Windows, Unix, Linix і іх параўнальная характарыстыка.

Сервіснае праграмнае забеспячэнне (ПЗ).

Сістэмная платформа аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (АБІС).

Класіфікацыя пакетаў прыкладных праграм (ППП).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці пабудовы прыкладнога ПЗ АБІС. Паняцце аўтаматызаванага рабочага месца (АРМ). Модульная структура ПЗ АБІС. Сучасныя тэндэнцыі ў стварэнні прыкладнога ПЗ.

Патрабаванні да ПЗ АБІС.

### *Тэма 2.23. Інфармацыйнае забеспячэнне АБІС*

Вызначэнне паняцця «інфармацыйнае забеспячэнне АБІС». Склад сродкаў інфармацыйнага забеспячэння АБІС. Уваходны інфармацыйны паток АБІС: відавы склад дакументаў, якія неабходна апрацаваць; склад звестак аб выданнях, якія паступілі на ўваход АБІС. Выхадны інфармацыйны паток АБІС.

Базы даных (БД) як асноўная частка інфармацыйнага забеспячэння АБІС. Відавы склад БД АБІС. Лагічная структура БД АБІС. Класіфікацыя мадэляў захоўвання даных (файлавая, іерархічная, сеткавая, рэляцыйная). Структура рэляцыйнай мадэлі даных (поле, запіс, ключавое поле).

### *Тэма 2.24. Фарматы даных у АБІС*

Камунікацыйны (абменны) фармат. Агульнасістэмны ці карпаратыўны фармат. Мэтавае прызначэнне фармату MARC. Патрабаванні да MARC фармату. Структура MARC фармату. Гісторыя распрацоўкі камунікатыўнага фармату MARC. Першы фармат MARC I (ЗША). Праект Брытанскай нацыянальнай бібліяграфіі – BNBMARC. Прычына з’яўлення нацыянальных MARC фарматаў: USMARC, UKMARC, CANMARC і інш. Мэта распрацоўкі міжнароднага фармату UNIMARC. Задачы фармату UNIMARC.

Мэта і задачы распрацоўкі фармату BELMARC. Суадносіны фарматаў BELMARC і UNIMARC. Распаўсюджванне фармату BELMARC у Беларусі. Выкарыстанне ў карпаратыўнай каталагізацыі.

Фарматы для бібліяграфічнага апісання сеткавых электронных рэсурсаў: Dublin Core (Дублинскае ядро) і MODS (Схема апісання метаданых аб’ектаў).

### *Тэма 2.25. Сродкі лінгвістычнага забеспячэння АБІС*

Паняцце лінгвістычнага забеспячэння (ЛЗ), яго прызначэнне ў АБІС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйна-пошукавая мова (ІПМ) у класе штучных моў. Немагчымасць выкарыстоўвання натуральных моў у інфармацыйным пошуку. Празмернасць і недастатковасць, эліпснасць штучнай мовы.

Тыпы ІПМ: вербальныя і класіфікацыйныя. Прадметызацыйныя, дэскрыптарныя і класіфікацыйныя ІПМ. Віды ІПМ. Патрабаванні да ІПМ. Лексіка ІПМ: лексічныя адзінкі (ЛА) ІПМ, план выяўлення і план зместу ЛА, ІПМ з кантралюючай і некантралюючай лексікай.

Граматыка ІПМ: пазіцыйная, мяшочная, паказальнікі ролі і паказальнікі сувязі. Парадыгматычныя і сінтагматычныя адносіны паміж ЛА ІПМ і сродкі іх адлюстравання ў інфармацыйна-пошукавых сістэмах.

### *Тэма 2.26. Індэксаванне дакумента ў АБІС*

Азначэнне паняцця «індэксаванне». Прызначэнне індэксавання як тэхналагічнага працэсу.

Якасць індэксавання: глыбіня і дакладнасць індэксавання. Віды індэксавання: сістэматызацыя, прадметызацыя і каардынатнае індэксаванне.

Рэжымы індэксавання. Прэдкаардынатнае і посткаардынатнае індэксаванне.

Празмернае індэксаванне – прызначэнне. Інфармацыйна-пошукавы тэзаўрус як асноўны сродак празмернага індэксавання. Методыка празмернага індэксавання. Узыходзячае празмернае індэксаванне, сыходнае празмернае індэксаванне. Агульныя правілы індэксавання.

### *Тэма 2.27. Дэскрыптарная мова як аснова інфармацыйна-пошукавага тэзаўруса*

Азначэнне паняццяў «ключавыя словы», «дэскрыптар». Прызначэнне дэскрыптараў. Перавагі дэскрыптарнай інфармацыйна-пошукавай мовы.

Дэскрыптарныя артыкулы як элемент слоўнікавай часткі інфармацыйна-пошукавага тэзаўруса (ІПТ). Віды парадыгматычных адносін.

Методыка пабудовы дэскрыптарных артыкулаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2.28. Інфармацыйна-пошукавы тэзаўрус: сутнасць і методыка распрацоўкі*

Паняцце ІПТ. Прызначэнне, віды і структура (ІПТ), яго месца і роля ў АБІС.

Этапы пабудовы ІПТ. Парадыгматычныя і сінтагматычныя адносіны паміж лексічнымі адзінкамі ў ІПТ.

Методыка распрацоўкі ІПТ: фарміраванне слоўніка ключавых слоў, дэскрыптарызацыя ключавых слоў, распрацоўка дэскрыптарных артыкулаў, устанаўленне сінтагматычных адносін, фарміраванне алфавітнага і пермутацыйнага паказальнікаў.

Аўтаматызацыя працэсаў распрацоўкі ІПТ. Падтрымка ІПТ у актуальным становішчы.

Выкарыстанне камунікатыўнага фармату BELMARC аўтарытэтных запісаў для прадстаўлення дэскрыптарных артыкулаў.

### *Тэма 2.29. Аўтарытэтны кантроль і аўтарытэтныя базы даных у АБІС*

Паняцце аўтарытэтнага кантролю. Прызначэнне баз даных аўтарытэтных запісаў у вядзенні і выкарыстанні бібліяграфічных баз даных. Асіметрыя знакаў натуральнай мовы. Пераадольванне асіметрыі знакаў натуральнай мовы сродкамі аўтарытэтнага кантролю. Спосабы размежавання аб’ектаў, якія маюць аднолькавае імя. Віды імён аб’ектаў аўтарытэтнага запісу (АЗ). Структура аўтарытэтнага запісу. Найбольш значныя кампаненты АЗ. Правілы выбару ўніфікаванага (прынятага) загалоўка АЗ. Спосабы размежавання ў аўтарытэтнай БД аб’ектаў, якія маюць аднолькавыя імёны. Устанаўленне сувязей паміж кропкамі доступу БЗ і АЗ і паміж імёнамі аднаго аб’екта.

### *Тэма 2.30. Сумяшчальнасць сродкаў інфармацыйна-лінгвістычнага забеспячэння АБІС*

Паняцце інфармацыйна-лінгвістычнай сумяшчальнасці. Ліквідацыя фарматнай несумяшчальнасці (несумяшчальнасць нацыянальных фарматаў MARC, роля абменнага фармату UNIMARC ва ўзаемадзеянні нацыянальных фарматаў MARC). Ліквідацыя несумяшчальнасці інфармацыйна-пошукавых моў (ІПМ) (паміж вербальнымі мовамі розных відаў на адной мове,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паміж вербальнымі мовамі аднаго віду на розных мовах, паміж вербальнымі і класіфікацыйнымі мовамі).

Метады лінгвістычнай сумяшчальнасці: метад адначасовага сумеснага выкарыстання некалькіх ІПМ у адной АБІС, метад перакладу, метад суаднясення, метад выкарыстання мовы-пасрэдніка, метад сувязі, метад аналізу сумеснай сустракаемасці тэрмінаў у БД.

### *Тэма 2.31. Праектаванне сродкаў лінгвістычнага забеспячэння*

Асноўныя падыходы да распрацоўкі інфармацыйна-пошукавай мовы (ІПМ): класіфікацыя ведаў, нармалізацыя прафесійнай тэрміналогіі, фармалізацыя семантычнага ўзроўню натуральнай мовы. Прынцыпы пабудовы класіфікатараў, рубрыкатараў іерархічнага тыпу. Дыферэнцыяцыя лексікі натуральнай мовы па ступені яе інфарматыўнасці. Методыка пабудовы інфармацыйна-пошукавых тэзаўрусаў. Спосабы прадстаўлення сінтагматычных суадносін у ІПМ розных тыпаў.

### *Тэма 2.32. Пакаленні web-праектаў*

Класіфікацыя web-сайтаў. Характэрныя асаблівасці персанальных, карпаратыўных/тэматычных і сацыяльных сайтаў. Парталы як разнавіднасць web-праектаў.

Характарыстыка даінтэрнэтаўскіх праектаў пакалення Web 0.0. Лінейныя двухкропкавыя сістэмы камунікацыі.

Характарыстыка праектаў пакалення Web 1.0. Першае пакаленне «Сусветнай павуціны».

Характарыстыка праектаў пакалення Web 2.0. Інтэрактыўнасць сістэмы, дыялогавае карыстанне web-рэсурсамі. «Сацыяльная павуціна».

Характарыстыка праектаў пакалення Web 3.0. Канцэпцыя Цімаці Бернерса-Лі «Семантычная павуціна».

### *Тэма 2.33. Асноўныя сеткавыя тэхналогіі web-сайтаў*

Класіфікацыя сродкаў web-распрацоўкі. Мова гіпертэкставай разметкі HTML. Каскадныя табліцы стыляў CSS. Скрыптавыя мовы: JavaScript, CGI-скрыпты. Скрыптавая мова PHP як альтэрнатыва CGI.

Шаблоны сайтаў і web-старонак: іх перавагі і недахопы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхналогія RSS-стужка: прызначэнне і магчымасці.

Паняцце «mashup»: магчымасці і сфера выкарыстання. Выкарыстанне мэшапаў на web-сайтах бібліятэк.

Віды сайтаў па тэхналогіях: статыстычныя сайты і web-старонкі, дынамічныя сайты (выкарыстанне скрыптаў), флэш-сайты. Уплыў выбранай тэхналогіі на дызайн і функцыянальнасць сайта.

### *Тэма 2.34. Жыццёвы цыкл web-сайта*

Праектаванне web-сайта як першы этап жыццёвага цыкла сайта. Асноўныя працэсы праектавання: вызначэнне мэтавай накіраванасці сайта, складу карыстальнікаў, улік фінансавых і працоўных рэсурсаў.

Стварэнне web-сайта: распрацоўка структуры, дызайна, падрыхтоўка зместавага напаўнення сайта.

Тэхнічны этап: распрацоўка гіпертэкставай структуры дакумента з выкарыстаннем HTML ці XML. Стварэнне знешніх і ўнутраных гіпертэкставых сувязей дакумента.

Тэсціраванне і публікацыя web-сайта. Выбар web-хостынга. Выбар і рэгістрацыя даменнага імя. Рэклама web-сайта.

Суправаджэнне і рэдызайн web-сайта. Тэхнічная падтрымка сайта. Інфармацыйнае і стратэгічнае развіццё.

### *Тэма 2.35. Дызайн web-сайта*

Асноўныя паняцці web-дызайна. Задачы і правілы web-дызайна. Кампазіцыя, колеравае і шрыфтавое афармленне сайта ў web-дызайне. Падрыхтоўка кантэнту. Патрабаванні да афармлення навігацыі сайта. Выкарыстанне элементаў фірменнага стылю: лагатып, фірменны колер, фірменны шрыфт.

Віды вёрсткі web-старонак: жорсткі і адаптыўны. Перавагі і недахопы розных відаў вёрсткі web-старонак. Выкарыстанне HTML пры афармленні знешняга выгляду старонак web-сайта. Выкарыстанне тэхналогіі CSS у web-дызайне.

### *Тэма 2.36. Тэарэтычныя аспекты і этапы развіцця электронных бібліятэк*

Паняцце «электронная бібліятэка». Асноўныя тэрміналагічныя падыходы спецыялістаў да вызначэння тэрміна «электронная бібліятэка» (Дж. Армс, А. Б. Антапольскі, Я. Л. Шрайберг).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцці «віртуальная бібліятэка», «сеткавая бібліятэка», «медыятэка» і іншыя, падабенства іх асноўных асаблівасцей і іх адрозненні. Асаблівасці электронных бібліятэк, іх асноўныя задачы і функцыі. Месца электронных бібліятэк сярод іншых інфармацыйных сістэм.

З'яўленне першых электронных бібліятэк як спроба стварэння бібліятэк навуковых часопісаў (праекты «Mercury», CORE, «Tulip», 1987–1993 гг.; JSTORE, з 1995 г.; «High Wire Press», з 1995 г. і інш.). Эвалюцыя метадаў апрацоўкі, аналізу, захавання, пошуку інфармацыі. З'яўленне новых носьбітаў інфармацыі. Узаемасувязь этапаў стварэння і станаўлення электронных бібліятэк з асноўнымі перыядамі развіцця электроннай вылічальнай тэхнікі, Інтэрнэту і сродкаў камп'ютарнай сувязі.

### *Тэма 2.37. Класіфікацыя электронных бібліятэк*

Асноўныя падыходы спецыялістаў да класіфікацыі электронных бібліятэк (А. І. Зямскоў, Я. Л. Шрайберг, А. Б. Антапольскі, К. У. Вігурскі і інш.). Класіфікацыя электронных бібліятэк па спосабе стварэння (генерыруемыя, агрэгіруемыя, змешаныя), па складзе дакументаў (монадакументныя і полідакументныя), па спосабе арганізацыі (самастойныя і ўключаныя ў больш агульны рэсурс). Класіфікацыя электронных бібліятэк па мэтавым прызначэнні (мемарыяльныя, вучэбныя, навуковыя, даведачныя і інш.). Нацыянальныя электронныя бібліятэкі. Электронныя бібліятэкі ўніверсітэтаў. Электронныя бібліятэкі мастацкай літаратуры. Сусветная лічбавая бібліятэка. Адукацыйныя электронныя бібліятэкі. Электронныя бібліятэкі выдавецтваў.

### *Тэма 2.38. Алічбоўка друкаваных дакументаў як працэс фарміравання электроннай бібліятэкі*

Паняцце «лічбавая копія друкаванага дакумента». Асноўныя падыходы да адбору друкаваных дакументаў з фондаў бібліятэк для іх пераводу ў лічбавую форму (суцэльная алічбоўка, сканіраванне актыўна выкарыстоўваемай часткі фонду, фарміраванне калекцый па тыпах дакументаў і асобных тэмах і інш.). Тэхналагічныя і арганізацыйныя аспекты працэсу сканіравання друкаваных дакументаў. Асаблівасці працэсу алічбоўкі музычных твораў, малюнкаў, тэкставых і графічных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прылады для сканіравання, іх асноўныя тэхнічныя характарыстыкі. Асноўныя этапы працэсу сканіравання (сканіраванне, распазнаванне інфармацыі, верыфікацыя даных, рэдагаванне і экспарт/захаванне даных). Асаблівасці работы з праграмамі для вываду графічнай і тэкставай інфармацыі на экран камп’ютара пасля сканіравання дакумента. Тэхналогіі аптычнага распазнання тэксту, інтэлектуальныя сістэмы распазнання (FineReader, Tesseract, RasterID і інш.). Асаблівасці запісу лічбавай інфармацыі. Тэхналагічныя аспекты захаванасці лічбавай інфармацыі.

### *Тэма 2.39. Тэхналогія фарміравання фонду электронных дакументаў*

Асновы мадэлявання фонду электронных дакументаў. Профіль фонду электронных дакументаў. Мадэлі камплектавання фонду электронных дакументаў. Крыніцы і спосабы набыцця электронных дакументаў. Алічбоўка як асноўны спосаб папаўнення фонду электронных дакументаў. Бібліятэчныя падыходы да адбору дакументаў для алічбоўкі. Прычыны выключэння электронных дакументаў.

Улік электронных дакументаў, аб’екты ўліку (электронныя дакументы з індывідуальнымі матэрыяльнымі носьбітамі, электронныя дакументы без індывідуальных матэрыяльных носьбітаў). Адзінкі ўліку электронных дакументаў. Інтэграваны і дыферэнцыраваны ўлік электронных дакументаў. Спецыфіка праверкі наяўнасці электронных дакументаў у фондзе. Праверка даступнасці сеткавых электронных дакументаў. Першасная, бібліяграфічная і канчатковая апрацоўка электронных дакументаў. Размяшчэнне і захаванне фонду электронных дакументаў. Фактары, якія ўплываюць на кіраванне фондам электронных дакументаў.

### *Тэма 2.40. Сродкі тэхнічнага забеспячэння АБІС*

Камп’ютарныя і перыферыйныя ўстройствы. Віды працэсараў, манітораў, прынтараў, сканераў, мадэмаў, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС. Сеткавае абсталяванне АБІС.

Тэхнічнае абслугоўванне АБІС.

Патрабаванні да тэхнічнага забеспячэння АБІС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2.41. Сродкі захавання, дастаўкі, капіравання і размнажэння дакументаў*

Захаванасць дакументаў у працэсе захоўвання і выкарыстання. Спосабы захоўвання і размяшчэння дакументаў. Тэмпературна-вільготнасны рэжым.

Стэлажнае абсталяванне сістэм захавання дакументаў. Транспарціроўка дакументаў. Аўтаматызаваныя праграмнакіруемыя транспартныя сістэмы адраснай дастаўкі дакументаў.

Сістэмы электроннай дастаўкі дакументаў.

Прынцып электраграфічнага капіравання, выкарыстоўваемая апаратура. Фотаэлектронны спосаб капіравання. Электраграфічнае і электронна-трафарэтнае капіраванне.

Рызаграфія. Тэхналогія працэсу, апаратура.

### *Тэма 2.42. Эрганамічнае забеспячэнне АБІС*

Паняцце эргономікі. Псіхалагічны бар'ер у рабоце з аўтаматызаванай сістэмай. Арганізацыя працоўных месцаў карыстальнікаў АБІС. Умовы работы с персанальнымі камп'ютарамі. Камп'ютарныя сіндромы. Санітарныя нормы і правілы. Гігіенічныя патрабаванні да ПЭВМ. Мікраклімат у бібліятэцы (тэмпература, вентыляцыя, асвятленне) і яго ўздзеянне на функцыянаванне АБІС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Метадычнае забеспячэнне дзейнасці розных тыпаў бібліятэк

### *Тэма 3.1. Веды аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле беларускіх тэрыторый як неабходная ўмова ажыццяўлення краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай работы бібліятэк*

Гісторыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу беларускіх тэрыторый. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель у ВКЛ. Стварэнне ваяводстваў і паветаў, уплыў рэформы 1565–1566 гг. на фарміраванне ўстойлівай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры краіны. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель у Расійскай імперыі. Развіццё адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР у міжваенны і пасляваенны перыяды. Кароткатэрміновыя структуры адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў гады Першай сусветнай вайны, Савецка-Польскай вайны, Другой сусветнай вайны, створаныя акупацыйнымі ўладамі на беларускіх землях. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь.

Выкарыстанне ведаў аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле беларускіх тэрыторый для падрыхтоўкі рэгіянальных інфармацыйных рэсурсаў, рэалізацыі бібліятэчных праектаў.

### *Тэма 3.2. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі як аб'екты рэгіёназнаўчай дзейнасці бібліятэк*

Комплекс прымет, па якіх ажыццяўляецца гісторыка-культурнае раяніраванне Беларусі: агульнасць гістарычнага лёсу насельніцтва, сацыяльна-эканамічнага развіцця, лінгвістычныя і этнаграфічныя асаблівасці, уплыў фізіка-геаграфічных фактараў і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу.

Лакальныя раёны комплекснай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Характарыстыка асобных прыкладаў лакальных раёнаў на падставе помнікаў археалогіі, гісторыі, архітэктуры, этнаграфіі, функцыянуючых музеяў і іншых адмысловых элементаў.

Роля бібліятэк у папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны і іх удзел у развіцці «кропак росту» захавання мясцовых традыцый і фарміравання культурнай прывабнасці рэгіёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 3.3. Бібліятэкі ў сістэме рэгіянальных сацыяльна-эканамічных комплексаў у Беларусі*

Рэгіянальныя сацыяльна-эканамічныя комплексы (РСЭК) як аснова тэрытарыяльнага размяшчэння эканомікі і яе асобных галін. Дзяржаўная палітыка развіцця РСЭК у Рэспубліцы Беларусь.

Вобласці Беларусі і г. Мінск як рэгіянальныя сацыяльна-эканамічныя комплексы. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця, структуры гаспадаркі, спецыялізацыі. Праблемы ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей. Дзяржаўныя мэтавыя комплексныя праграмы развіцця рэгіёнаў як інструменты ўпраўлення працэсамі фарміравання РСЭК у Рэспубліцы Беларусь. Знешнеэканамічныя сувязі РСЭК Беларусі.

Бібліятэкі як патэнцыяльныя партнёры органаў эканамічнага ўпраўлення ў рэгіёнах і суб'ектаў гаспадарання. Вопыт абласных універсальных, навукова-тэхнічных і іншых бібліятэк Беларусі па рэалізацыі партнёрскага ўзаемадзеяння і прадстаўлення рэсурсаў і паслуг па праблемах рэгіянальнага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

## *Тэма 3.4. Бібліятэкі ў сістэме інфармацыйнага забеспячэння рэгіянальнай інавацыйнай інфраструктуры Беларусі*

Пабудова інавацыйнай эканомікі Беларусі як дзяржаўная задача. Рэалізацыя «Государственной программы инновационного развития Республики Беларусь на 2016–2020 годы» на рэгіянальным узроўні і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм на 2016–2020 гг. Сучасныя рэгіянальныя інавацыйныя праграмы ў Рэспубліцы Беларусь.

Інавацыйныя цэнтры рэгіянальнага ўзроўню ў сістэме інавацыйнай інфраструктуры Беларусі: навуковых устаноў, устаноў вышэйшай адукацыі, навукова-тэхналагічных паркаў, інавацыйных бізнес-цэнтраў, цэнтраў трансферу тэхналогій. Фарміраванне інавацыйна-прамысловых кластараў.

Роля бібліятэк у інфармацыйным забеспячэнні рэгіянальных інавацыйных структур і праграм. Дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі, галіновых навукова-тэхнічных бібліятэк, бібліятэк устаноў вышэйшай адукацыі і іншых па стварэнні інфармацый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных рэсурсаў і паслуг у дапамогу рэалізацыі рэгіянальных праграм інавацыйнага развіцця.

### *Тэма 3.5. Метадычная дзейнасць бібліятэк у кантэксце развіцця бібліятэчнай справы*

Фактары, якія абумовілі ўзнікненне метадычных службаў бібліятэк.

Стварэнне і рэалізацыя сістэмы метадычнага кіраўніцтва ў бібліятэчнай справе СССР. Прадстаўленні Ю. А. Грыханава, Ю. М. Сталярова, Я. А. Фенелонава і інш. аб функцыях і змесце метадычнай работы.

Асаблівасці развіцця сістэмы кансультацыйна-метадычнага суправаджэння дзейнасці бібліятэк за мяжой.

Дыскусія аб прызначэнні і ролі метадыста, вызначэнне тэндэнцый і стратэгіі развіцця метадычных службаў бібліятэк на сучасным этапе. Змена кіраўніцкай канцэпцыі на кансультаванне або метадычнае забеспячэнне. Метадычная работа як працэс кіравання новаўвядзеннямі. Погляды С. А. Басава, І. М. Суславай, А. М. Ванеева, С. Г. Матлінай, Ю. Б. Аўраевай і інш. на сутнасць метадычнай дзейнасці бібліятэк і перспектывы яе развіцця.

Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да метадычных службаў на сучасным этапе.

### *Тэма 3.6. Сучасныя тэндэнцыі развіцця навукова-метадычнай дзейнасці ў бібліятэчнай сферы*

Напрамкі навукова-метадычнай дзейнасці, якія ажыццяўляюць бібліятэкі-метадычныя цэнтры.

Тэрміналагічная сістэма метадычнай дзейнасці.

Перагляд тэарэтычных падстаў метадычнай дзейнасці, узрастанне ступені навуковасці метадычнай дзейнасці, значэння метадычнага маніторынгу, пашырэнне спектра метадычных паслуг, аказанне метадычных паслуг у электронным асяроддзі, павелічэнне долі электронных метадычных рэсурсаў, кіраванне інавацыйнымі працэсамі, размеркаванне метадычнай дапамогі па тыпах бібліятэк, спецыялізацыя па праблемах і інш.

Фактары, якія негатыўна ўплываюць на развіццё навукова-метадычнай дзейнасці ў бібліятэчнай сферы: арганізацыйныя, метадалагічныя, эканамічныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3.7. Сутнасць і асноўныя кірункі метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк*

Значэнне і роля навукова-метадычнай работы ва ўдасканаленні дзейнасці бібліятэк.

Мэты, задачы, асноўныя напрамкі навукова-метадычнай работы. Прынцыпы і функцыі метадычнага забеспячэння.

Формы і метады навукова-метадычнай работы.

Элементы навуковай працы ў метадычнай дзейнасці, узаемасувязь навукова-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці.

Асноўныя напрамкі метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк: кансультацыйна-метадычная дапамога бібліятэкам, метадычнае суправаджэнне інавацыйнай дзейнасці бібліятэк, павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў і інш.

### *Тэма 3.8. Арганізацыя работы навукова-метадычных службаў бібліятэк розных тыпаў*

Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная бібліятэка Беларусі, рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі, абласныя бібліятэкі, цэнтральныя гарадскія і раённыя бібліятэкі як навукова-метадычныя цэнтры бібліятэчных сетак сваіх ведамстваў: арганізацыйна-функцыянальная структура, іерархічныя ўзроўні, кірункі дзейнасці.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі як каардынацыйны і метадычны цэнтр для сукупнай сеткі бібліятэк краіны.

Каардынацыя навукова-даследчай і метадычнай работы. Каардынацыя навукова-метадычных службаў рэспублікі: каардынацыйныя планы навукова-даследчай і навукова-метадычнай работы.

Метадычная служба ў цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме: арганізацыйная форма, штат, нарматыўна-прававая дакументацыя. Метадычная дапамога структурных падраздзяленняў бібліятэкі-метадычнага цэнтра па сваім профілі дзейнасці.

### *Тэма 3.9. Метадычнае кансультаванне ў бібліятэчнай справе*

Бібліятэка як аб’ект кансультацыйна-метадычнага забеспячэння: арганізацыйна-функцыянальная структура, лакальная нарматыўна-рэгламентуючая дакументацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Задачы метадычнага кансультавання, формы метадычнага кансультавання.

Агульная методыка падрыхтоўкі і аказання кансультацыйных паслуг. Патрабаванні да вусных і пісьмовых кансультацый.

Метадычнае кансультаванне як разнавіднасць экспертнай дапамогі. Арганізацыя кансультатыўнай дапамогі бібліятэкам за мяжой. Асноўныя прынцыпы кансалтынгавай дзейнасці. Арганізацыйная структура кіраўнічага кансультавання. Прафесійныя патрабаванні да кансультанта і этыка метадычнага кансультавання.

Сістэма метадычных выданняў, якія выпускаюцца метадычнымі службамі: метадычныя дапаможнікі, інфармацыйна-аналітычныя, даведачныя матэрыялы.

Дыстанцыйнае кансультаванне як разнавіднасць кансультатыўнай дзейнасці.

### *Тэма 3.10. Павышэнне кваліфікацыі і прафесіяналізацыя бібліятэчных кадраў*

Мэты і задачы павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў. Асноўныя напрамкі павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў. Патрабаванні да сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

Сістэма павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў у Рэспубліцы Беларусь, дзейнасць метадычных службаў бібліятэк па пытаннях бесперапыннай інфармацыйна-бібліятэчнай адукацыі. Адукацыйныя ўстановы вышэйшай і дадатковай адукацыі ў сферы культуры і мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь, якія займаюцца павышэннем кваліфікацыі і перападрыхтоўкай бібліятэчных кадраў.

Сучасныя падыходы да павышэння кваліфікацыі. Формы павышэння кваліфікацыі: навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, практыкумы, трэнінгі, майстар-класы, творчыя лабараторыі і інш. Прафесійная самаадукацыя бібліятэкараў.

Формы дыстанцыйнага навучання: вэб-семінары, анлайн-канферэнцыі, прэзентацыі і інш.

Прафесійныя выданні, іх роля ў самаадукацыі. Профільныя інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы адкрытага доступу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3.11. Аналітычная дзейнасць навукова-метадычных службаў бібліятэк розных тыпаў*

Аналіз бібліятэчнай практыкі як адзін з вядучых напрамкаў дзейнасці навукова-метадычных службаў бібліятэк. Віды і этапы аналізу бібліятэчнай практыкі. Выкарыстанне вынікаў аналітычнай дзейнасці ў метадычным забеспячэнні бібліятэк.

Метады колькаснага і якаснага аналізу бібліятэчнай практыкі.

Агляды дзейнасці бібліятэк, методыка іх складання. Алгарытм аналізу справаздач і напісання даведкі.

Абследаванне бібліятэк. Франтальнае і тэматычнае абследаванні бібліятэк, арганізацыя і парадак правядзення. Парадак інфармавання заснавальнікаў і калектыву бібліятэкі аб выніках абследавання.

Аналітычная дзейнасць як спосаб выяўлення і ўкаранення інавацыйных форм работы ў дзейнасць бібліятэкі.

Метадычны маніторынг у аналітычнай дзейнасці навуковаметадычных службаў.

### *Тэма 3.12. Навукова-метадычнае забеспячэнне інавацыйнай дзейнасці бібліятэк*

Навукова-метадычныя службы бібліятэк як элементы інфраструктуры інавацыйнай дзейнасці: мэты, задачы, кірункі дзейнасці. Функцыі метадычных службаў бібліятэк у стварэнні і прасоўванні інавацый.

Рашэнне арганізацыйных праблем інавацыйнай дзейнасці метадычнымі службамі: аналіз інавацыйнай сітуацыі, патрабаванняў карыстальнікаў да арганізацыі і зместу бібліятэчнага абслугоўвання, наладжванне сістэмы інавацыйных камунікацый, выяўленне фактараў, якія спрыяюць і перашкаджаюць інавацыйнай актыўнасці персаналу і інш.

Метадычныя службы бібліятэк у інавацыйным працэсе: вопыт беларускіх бібліятэк.

Перспектыўныя напрамкі метадычнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці бібліятэк: навучанне бібліятэчнага персаналу методыкам і тэхналогіям інавацыйнай дзейнасці, ацэнка эфектыўнасці новаўвядзенняў, рэгістрацыя інавацыйных ідэй, вызначэнне месца і ролі бібліятэкі ў сістэме інавацыйнай дзей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці дзяржавы, інфармацыйна-бібліятэчнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці ў краіне і інш.

### *Тэма 3.13. Метадычнае забеспячэнне бібліяграфічнай дзейнасці*

Сутнасць метадычнага забеспячэння бібліяграфічнай дзейнасці, яго асноўныя напрамкі.

Формы і метады метадычнай дапамогі ў арганізацыі і кіраванні бібліяграфічнай дзейнасцю.

Сістэма метадычнага забеспячэння бібліяграфічнай дзейнасці навукова-метадычнымі цэнтрамі бібліятэчных сетак розных ведамстваў: арганізацыйна-функцыянальная структура, іерархічныя ўзроўні. Удзел бібліяграфічных падраздзяленняў у метадычнай рабоце бібліятэкі.

Выяўленне, аналіз і ўкараненне інавацыйнага вопыту бібліяграфічнай дзейнасці. Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў бібліяграфічных падраздзяленняў бібліятэкі.

Асаблівасці метадычнай работы бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэк розных тыпаў.

Аналіз бібліяграфічных матэрыялаў і бібліяграфічных выданняў.

### *Тэма 3.14. Віртуальныя навукова-метадычныя службы бібліятэк*

Віртуальныя навукова-метадычныя службы бібліятэк: мэты, задачы, асноўныя напрамкі дзейнасці.

Спосабы арганізацыі і функцыянавання, рэсурсная база віртуальных навукова-метадычных службаў.

Прававыя механізмы функцыянавання віртуальных метадычных службаў. Карпаратыўнае ўзаемадзеянне з метадычнымі службамі бібліятэк іншых сістэм і ведамстваў.

Формы дыстанцыйнага навучання: анлайн-канферэнцыі, дыстанцыйныя лекторыі, вэбінары і інш.

Метадыст як куратар кантэнту сайта, арганізатар сеткавых зносін, асабістага вучэбнага асяроддзя карыстальніка.

Выкарыстанне інтэрнэт-сэрвісаў і сацыяльных медыя ў рабоце навукова-метадычных службаў. Старонкі і групы ў сацыяльных сетках (ВКонтакте, Facebook, Twitter), блогі («Библиомания», МетодистиК@, «Кропкі над і» і інш.), якія вядуць мета-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысты. Выкарыстанне ў метадычнай рабоце платформ Pinterest, Scoop.it (англамоўны), Categoriya, Calameo і інш.

### *Тэма 3.15. Тэхналогія паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў і ўзроставай дыферэнцыяцыі ў фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў*

Канцэптуальныя ідэі і прынцыпы асобасна арыентаванага навучання.

Сутнасная характарыстыка тэхналогіі паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў. Прымяненне тэхналогіі паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў у развіцці інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк.

Сутнасная характарыстыка тэхналогіі ўзроўневай дыферэнцыяцыі. Віды ўзроўневай дыферэнцыяцыі: дыферэнцыяцыя на аснове абавязковых вынікаў, унутрыгрупавая дыферэнцыяцыя, змешаная дыферэнцыяцыя. Прымяненне тэхналогіі ўзроўневай дыферэнцыяцыі ў фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк.

### *Тэма 3.16. Тэхналогіі супрацоўніцтва і развіццёвага навучання ў фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў*

Ідэі гуманізацыі навучання ў тэхналогіі супрацоўніцтва і яе мэтавыя арыентацыі. Сутнасная характарыстыка тэхналогіі супрацоўніцтва. Стадыі развіцця супрацоўніцтва. Прымяненне тэхналогіі супрацоўніцтва ў фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк.

Асноўныя ідэі тэорыі развіццёвага навучання. Сутнасная характарыстыка тэхналогіі развіццёвага навучання і яе прынцыпы. Прымяненне тэхналогіі развіццёвага навучання ў фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк.

### *Тэма 3.17. Методыка выкарыстання праблемных і камунікатыўных тэхналогій у фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк*

Сутнасць праблемных тэхналогій. Рэалізацыя праблемных тэхналогій праз пастаноўку праблемных сітуацый, задач, пытанняў. Метады арганізацыі праблемных тэхналогій: маналагічнага выкладання, выкладання-разважання, дыялагічнага вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кладання, эўрыстычных заданняў, даследчых заданняў, праграмных заданняў. Узроўні арганізацыі праблемных тэхналогій, іх функцыі, правілы, тэхналагічныя патрабаванні і этапы арганізацыі.

Прымяненне праблемных тэхналогій у фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк.

Тэхналогія арганізацыі дыскусіі як асноўны напрамак камунікатыўных тэхналогій.

Прымяненне камунікатыўных тэхналогій у фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк. Віды бібліятэчных інтэрактыўных мерапрыемстваў і тэхналогія іх падрыхтоўкі і ажыццяўлення. Методыка правядзення бібліятэчнага трэнінгу.

### *Тэма 3.18. Гульнявыя тэхналогіі фарміравання інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк*

Сутнасць гульнявых тэхналогій. Класіфікацыя гульнявых тэхналогій. Прынцыпы праектавання гульнявых тэхналогій: імітацыйнае мадэляванне канкрэтных умоў, гульнявое мадэляванне зместу і форм прафесійнай дзейнасці, праблемнага зместу, ролевыя зносіны, дыягнастычнасць, рэфлексія. Асноўныя этапы распрацоўкі і рэалізацыі гульнявой тэхналогіі. Выбар мэт навучальнай гульні, распрацоўка мадэлі гульні, выбар сюжэта, канструяванне гульнявой сітуацыі, вызначэнне сцэнарыя, роляў і сродкаў гульнявой сітуацыі.

Умовы рэалізацыі гульнявых тэхналогій для фарміравання інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк. Віды гульняў, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэцы. Структура бібліятэчнай гульні. Тэхналогіі выкарыстання дзелавой і развіццёвай гульні ў публічнай бібліятэцы.

### *Тэма 3.19. Мадэль прафесійных кампетэнцый бібліятэкара-метадыста*

Структура мадэлі метадыста, асноўныя падыходы да яе вызначэння. Кампетэнтнасны падыход. Кампетэнтнасць. Кампетэнцыя і кампетэнтнасць: падыходы да вызначэння. Кампаненты прафесійнай кампетэнтнасці: метадычная, псіхолага-педагагічная, сацыяльная, камунікатыўная, творчая і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прафесіяграма метадыста: характарыстыка яе структурных кампанентаў «ведаць – умець – мець (быць)».

Ключавыя кампетэнцыі метадыста: уменне прымаць рашэнні, класіфікаваць, абагульняць факты, рэфлексаваць над уласнымі метадычнымі дзеяннямі і г. д. Прафесійная кампетэнцыя і асабістыя якасці метадыста.

Інавацыйная творчасць бібліятэкара-метадыста як аснова ўдасканалення прафесійных якасцей.

Сучасныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да бібліятэкара-метадыста.

### *Тэма 3.20. Інфармацыйная кампетэнтнасць метадыста*

Тэарэтычныя асновы інфармацыйнай кампетэнтнасці бібліятэкара-метадыста. Суадносіны паняццяў «інфармацыйная кампетэнтнасць» і «камп'ютарная кампетэнтнасць».

Прымяненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у аналітычнай, кансультатыўна-метадычнай, маркетынгавай дзейнасці, у сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў як фактары, якія павышаюць ролю інфармацыйнай кампетэнтнасці метадыста.

Формы і віды прафесійных камунікацый. Арганізацыя фармальных і нефармальных камунікацый метадыстаў у электронным асяроддзі.

Бібліятэчныя сайты і парталы, персанальныя сайты спецыялістаў інфармацыйна-дакументнай сферы, мультымедыйныя навучальныя дапаможнікі як крыніцы прафесійных ведаў.

Прафесійныя камунікацыі як сродак самаадукацыі і павышэння прафесійнага майстэрства метадыста.

Напрамкі ўдасканалення сістэмы інфармацыйнага забеспячэння бібліятэчных спецыялістаў у Рэспубліцы Беларусь.

### *Тэма 3.21. Тэарэтычныя асновы метадычнага маніторынгу*

Змест і сутнасць паняццяў «маніторынг», «метадычны маніторынг». Выкарыстанне маніторынгу ў аналітычнай і даследчай дзейнасці бібліятэк. Прыкладная накіраванасць маніторынгавых даследаванняў у бібліятэках.

Прымяненне маніторынгу ў бібліятэчнай справе; метадычны маніторынг у дзейнасці навукова-метадычных службаў бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Функцыі метадычнага маніторынгу. Мэты і задачы метадычнага маніторынгу. Прынцыпы метадычнага маніторынгу.

Аб’екты метадычнага маніторынгу: дынаміка паказчыкаў дзейнасці бібліятэк; рух бібліятэчных кадраў; выяўленне і распаўсюджванне бібліятэчных інавацый; дакументны паток па бібліятэчнай справе.

Арганізацыйныя і метадалагічныя праблемы метадычнага маніторынгу на сучасным этапе.

### *Тэма 3.22. Асноўныя напрамкі і метадалогія правядзення маніторынгавых даследаванняў у бібліятэках*

Асноўныя напрамкі метадычнага маніторынгу: стан сеткі бібліятэк, дынаміка асноўных паказчыкаў іх дзейнасці, стан бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў, фарміраванне і выкарыстанне бібліятэчных фондаў і электронных інфармацыйных рэсурсаў, стан навукова-метадычнай дзейнасці, кадравы патэнцыял бібліятэк, павышэнне кваліфікацыі, стан сувязей з грамадскасцю, узровень інфарматызацыі, стан матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк, фінансаванне бібліятэчнай дзейнасці.

Прынцыпы збору даных пры правядзенні метадычнага маніторынгу.

Паняцці «метад», «тэхніка», «методыка» і «працэдура маніторынгавых даследаванняў», іх змест.

Метадалагічныя патрабаванні да метадычнага маніторынгу: абавязковы ахоп усіх значных бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў і ўсіх структурных падраздзяленняў бібліятэкі; наяўнасць сістэмы кантралюемых статыстычных і сацыялагічных паказчыкаў і індыкатараў; наяўнасць сітуацыйных паказчыкаў; апрацоўка эмпірычнай інфармацыі з ужываннем праграмна-апаратнага забеспячэння; наяўнасць адзінага банка статыстычнай і сацыялагічнай інфармацыі і г. д.

### *Тэма 3.23. Арганізацыя, тэхналогія і методыка правядзення маніторынгавых даследаванняў у бібліятэках*

Вызначэнне тэматыкі метадычнага маніторынгу, абгрунтаванне неабходнасці правядзення даследавання. Крыніцы інфармацыі для метадычнага маніторынгу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выбар паказчыкаў работы бібліятэк, выбар інструментаў для збору даных. Метады збору інфармацыі пры правядзенні маніторынгавых даследаванняў.

Маніторынг фарміравання і выкарыстання бібліятэчных фондаў, маніторынг інфармацыйнай (бібліяграфічнай, фактаграфічнай і інш.) прадукцыі, іх этапы: арганізацыйны; дакументацыйны; кадравы; інфармацыйны; рабочы; этап укаранення.

Маніторынг працы з карыстальнікамі. Маніторынг індывідуальнай, групавой і масавай работы, маніторынг чытацкай актыўнасці. Этапы маніторынгаў: папярэдні, праектавання і рэалізацыі, кантрольна-ацэначны.

Падвядзенне вынікаў маніторынгавых даследаванняў. Распрацоўка і рэалізацыя плана ўкаранення вынікаў маніторынгу, ацэнка эфектыўнасці маніторынгу.

Маніторынг анлайнавых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі. Комплекс параметраў (якасных, структурных, тэхнічных, лінгвістычных), якія ўлічваюцца пры аналізе электронных бібліятэк і сайтаў, якія змяшчаюць нацыянальныя інфармацыйныя рэсурсы.

***Тэма 3.24. Стандартызацыя бібліятэчнай статыстыкі***

Сутнасць стандартызацыі і яе роля ў галіне бібліятэчнай статыстыкі. Узроўні стандартызацыі бібліятэчнай статыстыкі.

Дзейнасць IFLA і ISO ў галіне ўдасканалення паказчыкаў дзейнасці бібліятэк. Маніфест IFLA аб бібліятэчнай статыстыцы (2010). Асноўныя замежныя стандарты ў галіне бібліятэчнай статыстыкі, у тым ліку стандарт ISO 2789 : 2013 «Інфармацыя і дакументацыя. Міжнародная бібліятэчная статыстыка», ISO 11620 : 2014 «Інфармацыя і дакументацыя. Паказчыкі эфектыўнасці работы бібліятэк» і інш.

Нацыянальны стандарт па бібліятэчнай статыстыцы Рэспублікі Беларусь СТБ 7.20-2000 «Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні»: агульная характарыстыка стандарту. Перспектывы ўдасканалення нацыянальнага бібліятэчнага стандарту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 3.25. Разлік асноўных паказчыкаў дзейнасці бібліятэкі. Пабудова статыстычных табліц*

Абсалютныя, сярэднія і адносныя статыстычныя паказчыкі. Абсалютныя паказчыкі як сумiраваныя даныя першаснага ўліку ў канкрэтных межах часу і месца. Сярэднія паказчыкі як зводная характарыстыка аднародных велічынь.

Адносныя паказчыкі і іх віды: дынамікі, структуры, інтэнсіўнасці. Паказчыкі дынамікі як велічыні, якія характарызуюць змены з'явы ў часе. Паказчыкі структуры як адносныя велічыні, якія паказваюць стаўленне лічбы да цэлага. Паказчыкі інтэнсіўнасці: чытальнасць, наведвальнасць, абарачальнасць, кнігазабяспечанасць, кнігазабяспечанасць жыхара, працэнт ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем, шчыльнасць бібліятэчнай сеткі, даступнасць бібліятэчнай сеткі. Разлік паказчыкаў.

Групоўка і зводка матэрыялу. Тыпалагічная, структурная і аналітычная групоўка матэрыялу. Статыстычная зводка, аб'ект-дзейнік, аб'ект-выказнік; віды статыстычных табліц: простыя, групавыя, камбінаваныя.

Алгарытм статыстычнага аналізу: пастаноўка мэты аналізу, падбор і ацэнка статыстычных матэрыялаў, сістэматызацыя даных, разлік статыстычных паказчыкаў, высновы.

Комплекс паказчыкаў афіцыйнай бібліятэчнай статыстыкі. Форма дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці ў Рэспубліцы Беларусь – форма 1 – бібліятэка (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці публічнай бібліятэкі», яе агульная характарыстыка.

## *Тэма 3.26. Якасць як базавая катэгорыя і аб'ект менеджменту*

Якасць прадуктаў і паслуг як сучасная тэндэнцыя развіцця грамадства. Паняцце і сутнасць катэгорыі «якасць».

Асаблівасці тэрміналогіі якасці ў бібліятэчнай сферы. Якасць і катэгорыя спажывецкай каштоўнасці. Паняцце бібліятэчна-бібліяграфічнай прадукцыі/паслугі як вынік бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, праблема класіфікацыі бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў/паслуг. Характарыстыка спажыўцоў і зацікаўленых бакоў у якасці бібліятэчна-бібліяграфічных прадуктаў/паслуг. Уласцівасці бібліятэчна-бібліяграфічных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паслуг і іх уплыў на выбар паказчыкаў, крытэрыяў, метадаў іх ацэнкі. Паняцце канкурэнтаздольнасці бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.

Якасць як аб’ект кіравання ў бібліятэцы. Характарыстыка аб’екта, суб’екта, арганізацыйных структур, функцый і метадаў кіравання якасцю ў бібліятэцы.

### *Тэма 3.27. Сістэма менеджменту якасці ў бібліятэцы: сутнасць і змест*

Паняцце і асноўныя задачы сістэмы менеджменту якасці (СМЯ). Кіраванне якасцю на аснове стандартаў ISO серыі 9000. Прынцыпы менеджменту якасці. Характарыстыка зместу прынцыпаў кіравання якасцю: арыентацыя на спажыўца; лідарства кіраўніка; уцягванне работнікаў; працэсны падыход; сістэмны падыход да менеджменту; пастаяннае паляпшэнне; прыняцце рашэнняў, заснаванае на фактах; узаемавыгадныя адносіны з пастаўшчыкамі.

Асноўныя этапы стварэння і ўкаранення СМЯ ў дзейнасць бібліятэк. Дакументаванне СМЯ. Характарыстыка асноўных відаў дакументацыі СМЯ: Палітыка (місія) бібліятэкі і мэты ў галіне якасці; Кіраўніцтва па якасці; стандарты прадпрыемства; дакументаваныя працэдуры на асноўныя тэхналагічныя працэсы бібліятэкі і дакументаванне асноўных працэдур СМЯ; рабочыя інструкцыі. Маніторынг, вымярэнне і аналіз дзейнасці бібліятэк як састаўная частка ўкаранення і функцыянавання СМЯ ў бібліятэцы. Аўдыт якасці: азначэнне, статус, віды. Самаацэнка дзейнасці бібліятэк: тэхналогія правядзення. Сертыфікацыя сістэм менеджменту якасці.

### *Тэма 3.28. Ацэнка і вымярэнне эфектыўнасці і якасці бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці*

Кваліметрыя як навука аб вымярэнні якасці прадукцыі і паслуг.

Ацэнка дзейнасці бібліятэк у паняццях эфектыўнасці і якасці. Паняцце аб крытэрыях і паказчыках як вымяральніках эфектыўнасці і якасці. Патрабаванні, сфармуляваныя ў міжнародных стандартах, да вызначэння паказчыкаў/індыкатараў эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк. Віды паказчыкаў якасці па колькасці характарызуемых уласцівасцей (адзінкавыя, комплекс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя, адносныя, інтэгральныя). Уяўленне аб сістэме збалансаваных паказчыкаў дзейнасці бібліятэк, якія адлюстроўваюць усе яе аспекты, звязаныя з выдаткамі і вынікамі дзейнасці. Характарыстыка паказчыкаў/індыкатараў эфектыўнасці ў кантэксце рэкамендацый стандарту ISO 11620 (1998; 2014) «Информация и документация. Показатели эффективности деятельности библиотек».

Якасць інфармацыйных прадуктаў і паслуг бібліятэкі: вызначэнне, асноўныя характарыстыкі, паказчыкі.

Метады вывучэння сацыяльнай, эканамічнай, функцыянальнай эфектыўнасці бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў і якасці бібліятэчна-бібліяграфічных прадуктаў і паслуг.

### *Тэма 3.29. Тэхналагічны менеджмент як складаючая сістэмы кіравання бібліятэкай*

Тэхналогія: асноўныя падыходы да трактоўкі зместу паняцця, структура. Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент: сутнасць і месца ў сістэме агульнага менеджменту бібліятэкі. Асноўныя аб'екты і суб'екты тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту. Бібліятэчная тэхналогія: сутнасць паняцця, характэрныя асаблівасці.

Значэнне і задачы тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту для функцыянавання бібліятэкі як тэхналагічнай сістэмы. Аналіз бібліятэчных тэхналогій як аснова распрацоўкі тэхналагічнай і структурна-функцыянальнай мадэлі бібліятэкі. Узаемасувязь стратэгічных і інавацыйных напрамкаў развіцця бібліятэкі з тэхналагічнымі рашэннямі. Функцыянаванне бібліятэкі як тэхналагічнай сістэмы.

Асноўныя тэхналагічныя цыклы бібліятэк: фарміраванне фондаў, фарміраванне бібліяграфічных баз даных, абслугоўванне карыстальнікаў і інш. Працэсы і аперацыі як састаўная частка бібліятэчнай тэхналогіі.

### *Тэма 3.30. Сістэма прынцыпаў і функцый тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту*

Прынцыпы і функцыі тэхналагічнага менеджменту: азначэнне паняццяў, прызначэнне. Прынцыпы кіравання А. Фаёля і рацыянальнага кіравання Г. Эмерсана як аснова рацыянальнай арганізацыі вытворчасці. Суадносіны агульных прынцыпаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менеджменту і прынцыпаў тэхналагічнага менеджменту. Прыватныя прынцыпы тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту: аб'ектыўнасці і паўнаты інфармацыі ў кіраванні тэхналагічнай сістэмай, бесперапыннасці тэхналагічнага працэсу, найкарацейшага маршруту (праматочнасці), аптымальнасці, рытмічнасці і раўнамернасці і інш. Агульная характарыстыка прынцыпаў.

Функцыі менеджменту як кірункі ўпраўленчай дзейнасці. Функцыі тэхналагічнага менеджменту: агульныя і дапаможныя. Класіфікацыя функцый тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту ў залежнасці ад стадый кіравання: стадыя прыняцця кіраўнічага рашэння, стадыя рэалізацыі рашэння, стадыя кантролю.

### *Тэма 3.31. Нарміраванне бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў*

Нарміраванне бібліятэчнай працы: значэнне, сутнасць і асаблівасці. Нарміраванне бібліятэчных працэсаў як фактар кіравання працоўнымі рэсурсамі. Віды норм. Нормы часу і нормы выпрацоўкі. Тыпавыя нормы часу на бібліятэчныя працэсы. Прычыны стварэння мясцовых (лакальных) норм.

Патрабаванні да працэсу нарміравання. Характарыстыка этапаў нарміравання: аналіз стану нарміравання працы ў бібліятэцы; падрыхтоўчыя і арганізацыйна-метадычныя работы па правядзенні нарміравання; замеры працоўнага часу; апрацоўка сабраных матэрыялаў і стварэнне нарматываў затрат працы; праверка норм у вытворчых умовах; падрыхтоўка канчатковай рэдакцыі нарматыўных матэрыялаў; укараненне норм.

Метады нарміравання: хронаметраж, фатаграфія (самафатаграфія) працоўнага дня, відэаздымка працоўных працэсаў і інш. Выбар метаду нарміравання бібліятэчных працэсаў. Методыка правядзення, апрацоўкі і карэкціроўкі хронаметражных назіранняў.

Асаблівасці і асноўныя этапы нарміравання бібліятэчных тэхналагічных працэсаў у аўтаматызаваным рэжыме.

### *Тэма 3.32. Тэхналагічная служба бібліятэкі*

Тэхналагічная служба: азначэнне паняцця. Варыянты існавання тэхналагічных службаў бібліятэк: спецыялізаванае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структурнае падраздзяленне бібліятэкі, савет тэхнолагаў, аддзелы аўтаматызацыі, якія ажыццяўляюць тэхналагічнае суправаджэнне АБІС і інш.

Структура тэхналагічных службаў. Фактары, якія ўплываюць на іх склад. Асноўныя арганізацыйныя кампаненты.

Характарыстыка асноўных задач тэхналагічных службаў бібліятэк: аперацыйны аналіз тэхналагічных працэсаў; ацэнка нарматыўна-метадычнага забеспячэння тэхналагічных працэсаў; пабудова тэхналагічных маршрутаў; ацэнка рэсурснай базы бібліятэчнай вытворчасці; нарміраванне тэхналагічных працэсаў; ацэнка працаёмкасці бібліятэчнай вытворчасці; калькуляцыя сабекошту інфармацыйных прадуктаў і паслуг; ацэнка якасці прадуктаў і паслуг; кантроль тэхналагічных працэсаў.

Патрабаванні да кампетэнцый тэхнолагаў. Абавязкі менеджара-тэхнолага.

### *Тэма 3.33. Арганізацыйна-тэхналагічная дакументацыя бібліятэкі*

Бібліятэчная арганізацыйна-тэхналагічная дакументацыя: змест паняцця. Сістэма арганізацыйна-тэхналагічнай дакументацыі бібліятэкі і яе значэнне для рацыянальнай арганізацыі жыццядзейнасці бібліятэкі. Патрабаванні да арганізацыйна-тэхналагічнай дакументацыі бібліятэкі.

Тэхналагічны дакумент: азначэнне паняцця. Асноўныя віды бібліятэчных тэхналагічных дакументаў: блок-схема, маршрутная карта, тэхналагічная карта, тэхналагічная інструкцыя, тэхналагічная ведамасць, тэхналагічны рэгламент, рабочая інструкцыя.

Арганізацыйна-распарадчыя дакументы бібліятэкі: правілы, пратаколы, рашэнні, інструкцыі, загады і акты, палажэнні аб структурных падраздзяленнях, калегіяльных і дарадчых органах бібліятэкі, інструкцыі па асобных відах дзейнасці, памяткі і інш. Роля гэтых дакументаў ва ўпарадкаванні бібліятэчнай тэхналогіі.

Унутраная база дакументаў, рэгламентуючых бібліятэчную тэхналогію: формы і віды дакументаў. Тэрміны дзейнасці тэхналагічнай дакументацыі. Мадэляванне аптымальнага блока рэгламентуючай тэхналагічнай дакументацыі бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3.34. Мадэляванне бібліятэчнай тэхналогіі*

Патрабаванні і прынцыпы ўкаранення новых тэхналогій.

Напрамкі ўдасканалення бібліятэчных цыклаў: упарадкаванне існуючай бібліятэчнай тэхналогіі, пошук інавацыйных тэхналагічных рашэнняў, кіраванне працэсамі замены ўстарэлай тэхналогіі і абсталявання.

Этапы распрацоўкі тэхналагічнага працэсу. Аперацыйна-тэхналагічны аналіз тэхналагічных цыклаў бібліятэкі, стварэнне тэхналагічных картатэк. Пабудова імітацыйных мадэляў працэсаў і цыклаў з дапамогай блок-схем. Графічныя метады аналізу: састаўленне мадэлі скразных функцыянальных блок-схем паміж аддзеламі і маршрутных карт. Алгарытм тэхналагічнага маршруту. Распрацоўка тэхналагічных карт. Выкарыстанне тэхналагічных карт для выпрамлення тэхналагічнага працэсу, ліквідацыі лішніх элементаў, дубліравання.

Мадэляванне бібліятэчных працэсаў. Віды мадэлявання ў тэхналагічным бібліятэчным менеджменце: эканоміка-матэматычны, мадэлі сістэмнага аналізу, метады імітацыйнага мадэлявання. Класіфікацыя метадаў імітацыйнага мадэлявання: пазнавальныя, прагнозныя і кіраўнічыя мадэлі.

Афармленне вынікаў тэхналагічнага мадэлявання бібліятэчных працэсаў.

### *Тэма 3.35. Дзяржаўнае кіраванне выдавецкай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь*

Арганізацыя выдавецкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь і яе нарматыўна-прававое забеспячэнне. Дзейнасць дзяржаўных органаў і арганізацый па развіцці выдавецкай справы: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі (функцыі, напрамкі дзейнасці). Роля Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы аўтарскага права суб'ектаў выдавецкай дзейнасці.

Формы дзяржаўнай падтрымкі выдавецкай дзейнасці (прамая дзяржаўная падтрымка сацыяльна значных праектаў, ускосная дзяржаўная падтрымка). Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў.

Агульныя палажэнні Закона «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь». Дзяржаўная рэгістрацыя і перарэгістрацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдаўцоў. Адказнасць выдаўцоў за парушэнне заканадаўства аб выдавецкай справе.

### *Тэма 3.36. Рэдакцыйна-выдавецкі працэс у бібліятэцы*

Азначэнне паняцця «рэдакцыйна-выдавецкі працэс», асаблівасці яго арганізацыі ў бібліятэках розных тыпаў і відаў.

Рэдакцыйная стадыя рэдакцыйна-выдавецкага працэсу. Адзнака і рэдакцыйная падрыхтоўка выдання да вытворчасці, рэцэнзаванне. Віды рэдагавання ў залежнасці ад тыпу выдання.

Выдавецкая стадыя рэдакцыйна-выдавецкага працэсу. Вычытка выдавецкага арыгінала і яго тэхнічнае рэдагаванне. Падрыхтоўка арыгінал-макета да выдання.

Вытворчая стадыя рэдакцыйна-выдавецкага працэсу. Непасрэдны набор і вёрстка арыгінала. Віды друку. Пераплётныя і аддзелачныя работы. Віды пераплёту.

Маркетынгавая стадыя рэдакцыйна-выдавецкага працэсу. Распаўсюджванне тыражу выробленай у бібліятэцы выдавецкай прадукцыі ў інфармацыйнай прасторы рэгіёна/краіны.

### *Тэма 3.37. Рэдагаванне як частка рэдакцыйна-выдавецкага працэсу ў бібліятэцы*

Азначэнне паняцця «рэдагаванне»: шырокае і вузкае разуменне. Асаблівасці арганізацыі працэсу рэдагавання ў рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці бібліятэкі. Змест працэсу рэдагавання.

Методыка першага скразнога чытання. Давядзенне выдавецкага арыгінала да камплектнасці. Праца над структурай (кампазіцыяй) выдавецкага арыгінала. Вызначэнне адзінага стылю прадстаўлення тэксту. Праца з дапаможнай і службовай часткамі будучага выдання. Праца над загалоўкамі. Рэдактарская праўка выдавецкага арыгінала.

Агульнае (універсальнае) рэдагаванне. Ліквідацыя лагічных памылак. Тыповыя лагічныя памылкі. Ліквідацыя фактычна-лагічных памылак: гістарычнага і геаграфічнага характару, друкаванага і «лічбавага» характару, «візуальнай» неадпаведнасці.

Спецыяльнае рэдагаванне: літаратурнае, навуковае, мастацкае, тэхнічнае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3.38. Маркетынг у выдавецкай дзейнасці бібліятэкі*

Азначэнне паняцця «маркетынг у выдавецкай дзейнасці», асаблівасці яго арганізацыі ў бібліятэцы. Задачы, функцыі і прынцыпы маркетынгу ў выдавецкай дзейнасці бібліятэкі.

Рэкламная дзейнасць як элемент структуры маркетынгу ў выдавецкай дзейнасці бібліятэкі. Віды выдавецкай рэкламнай работы. Рэклама ідэй і намераў. Рэклама выдавецкай прадукцыі і паліграфічных паслуг на ўзроўні плана рэдакцыйнай падрыхтоўкі. Рэклама на лістах і буклетах. Рэклама ў каталогах выдавецкай прадукцыі. Рэклама ў сродках масавай інфармацыі.

Збыт выдавецкай прадукцыі і выкананне паліграфічных паслуг як вынік маркетынгу ў выдавецкай дзейнасці бібліятэкі.

### *Тэма 3.39. Навукова-метадычныя даследаванні ў бібліятэках: агульная характарыстыка*

Навуковая работа ў бібліятэчна-бібліяграфічнай сферы: суб’ект, аб’ект, прадмет, мэта, сродкі, метады, вынікі. Сувязь навукі і практычнай бібліятэчна-біліяграфічнай дзейнасці. Узрастанне ролі бібліятэчнай, бібліяграфічнай навукі, неабходнасць актыўнага ўкаранення вынікаў навуковых даследаванняў у практыку.

Віды навуковых даследаванняў. Сутнасць навукова-метадычных даследаванняў і іх асноўныя задачы на сучасным этапе. Арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці ў бібліятэках Рэспублікі Беларусь.

### *Тэма 3.40. Структура і змест асноўных этапаў даследчага працэсу*

Распрацоўка праграмы навукова-метадычнага даследавання. Метадалагічны блок навукова-метадычнага даследавання. Супярэчнасць і праблема даследавання. Выбар і абгрунтаванне тэмы даследавання. Абгрунтаванне актуальнасці і навізны даследавання. Фармуляванне аб’екта, прадмета, мэты і задач даследавання. Гіпотэза, яе віды і фармулёўка. Арганізацыйна-метадычны блок праграмы навуковага даследавання. Агульналагічныя, агульнанавуковыя, спецыяльныя метады. Колькасныя і якасныя метады збору даных, іх магчымасці і абмежаванні. Забеспячэнне абгрунтаванасці і дакладнасці зыходных даных. Паняцце генеральнай і выбарачнай сукупнасці. Рэпрэзентатыўнасць. Аб’ём выбаркі. Памылка выбаркі. Віды выбарак і прын-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыпы іх фарміравання. Плануемае прадстаўленне вынікаў даследавання. Тэрмін выканання навукова-метадычнага даследавання.

### *Тэма 3.41. Метады вывучэння паняццяў і дакументаў у бібліятэчна-бібліяграфічным даследаванні*

Тэарэтычныя асновы метаду тэрміналагічнага аналізу. Магчымасці яго выкарыстання ў даследаванні бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў і з'яў. Этапы і методыка тэрміналагічнага аналізу. Вызначэнне базавага і падпарадкаваных тэрмінаў, устанаўленне тэрмінасістэмы. Этымалагічны аналіз тэрмінаў, даследаванне працэсу іх фарміравання і развіцця. Удакладненне і фармулёўка сучаснага вызначэння тэрміна.

Агульная характарыстыка метаду аперацыяналізацыі паняццяў. Этапы і методыка правядзення аперацыяналізацыі паняццяў. Аперацыйнае вызначэнне паняццяў, фарміраванне сістэмы індыкатараў у адпаведнасці з гіпотэзай даследавання.

Класіфікацыя метадаў вывучэння дакументаў. Этапы і методыка кантэнт-аналізу. Метады аналізу паняційнага слоўніка, сутнасць і методыка прымянення ў бібліятэчна-бібліяграфічным даследаванні.

Вывучэнне чытачоў бібліяграфічным метадам, сутнасць і методыка.

### *Тэма 3.42. Метад апытання ў даследаванні бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў і з'яў*

Сутнасць і магчымасці метаду апытання пры даследаванні бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў і з'яў. Віды апытання: анкетаванне і інтэрв'юіраванне; іх параўнальныя магчымасці, перавагі і недахопы. Методыка анкетавання. Віды анкетных пытанняў па ступені стандартызацыі (закрытыя, напаўзакрытыя і адкрытыя); па канструктыўных асаблівасцях (дыхатамічныя, альтэрнатыўныя, поліварыянтныя); па функцыях (фільтры, кантрольныя, пасткі). Уступная, базісная і заключная часткі анкеты. Метадычныя патрабаванні да анкеты.

Інтэрв'юіраванне, яго віды. Фармалізаванае, напаўфармалізаванае, нефармалізаванае інтэрв'ю. Этапы падрыхтоўкі і правядзення інтэрв'ю. Метад фокус-груп, сутнасць, перавагі і недахопы метаду. Фарміраванне фокус-груп. Арганізацыя правядзення фокус-груп.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## *Крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў на дзяржаўным экзамене па вучэбных дысцыплінах напрамку спецыяльнасці*

**1 бал** – адсутнасць адказу. Студэнт адмаўляецца ад адказу ці адказ цалкам не адпавядае прапанаваным пытанням.

**2 балы** – студэнт не ведае значнай часткі праграмнага матэрыялу, не можа вызначыць бібліятэчныя і бібліяграфічныя з'явы, недакладна ўжывае тэрміны і паняцці.

**3 балы** – узнаўленне часткі праграмнага матэрыялу па памяці, фрагментарны пераказ і пералічэнне аб'ектаў вывучэння; дапускаюцца грубыя памылкі ў азначэннях бібліятэчных паняццяў, не прыводзяцца прыклады з практычнай дзейнасці бібліятэк.

**4 балы** – недастаткова асэнсаванае ўзнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці. Уменне прыводзіць прыклады з практыкі работы бібліятэк, але не заўсёды дакладнае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй; па адным з пытанняў недастатковае веданне тэарэтычных палажэнняў.

**5 балаў** – асэнсаванае ўзнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці.

**6 балаў** – асэнсаванне і ўзнаўленне ўсяго вучэбнага матэрыялу. Апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, прывядзенне прыкладаў з практыкі, уменне класіфікаваць з'явы і вынікі дзейнасці бібліятэк. Наяўнасць неістотных памылак.

**7 балаў** – поўныя, дакладныя веды і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, раскрыццё сутнасці асноўных паняццяў, але ў выкарыстанні тэрміналогіі дапускаюцца памылкі.

**8 балаў** – поўныя, дакладныя, грунтоўныя веды і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, раскрыццё сутнасці асноўных паняццяў. Наяўнасць неістотных фактычных памылак.

**9 балаў** – усебаковае, сістэмнае веданне матэрыялу. Раскрыццё розных падыходаў да трактоўкі з'яў, асноўных кірункаў дзейнасці бібліятэк. Дакладнасць азначэння тэрмінаў, паўната адказаў. Паслядоўнасць і лагічнасць выкладання матэрыялу.

**10 балаў** – усебаковае веданне праграмнага матэрыялу і яго вольнае выкладанне, веданне тэарэтычных асноў. Абгрунтаванне сваёй пазіцыі да трактоўкі той ці іншай з'явы дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйных устаноў. Уменне суадносіць веды па напрамку атрымліваемай спецыяльнасці з практычнай дзейнасцю бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Літаратура*

*Раздзел І.*
*Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент*

*Асноўная*


*1.1. СТБ 7.20-2000.* Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні = Библиотечная статистика. Основные положения. – Введ. 01.09.2000. – Мінск : Дзяржстандарт, Б.г. [2000]. – 6 с. – (Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе).

*1.2. Ахмадова, Ю. А.* Менеджмент качества и библиотека : учеб.-практ. пособие / Ю. А. Ахмадова, Е. Я. Галимова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2007. – 88 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век» ; вып. 55).

*1.3. Ахмадова, Ю. А.* Система менеджмента качества библиотеки : учеб.-практ. пособие / Ю. А. Ахмадова ; науч. ред. В. В. Брежнева. – СПб. : Профессия, 2007. – 260, [4] с. : табл. – (Библиотека).

*1.4. Басамыгина, И. Н.* Микроэкономика библиотечного дела: науч.-практ. пособие / И. Н. Басамыгина. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 160 с.

*1.5. Галковская, Ю. Н.* Информационный рынок и его правовое обеспечение : учеб.-метод. комплекс / Ю. Н. Галковская ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2017. – С. 88–108, 115–119, 125–130.

*1.6. Галковская, Ю. Н.* Правовое обеспечение деятельности библиотек в Республике Беларусь : науч.-практ. пособие / Ю. Н. Галковская. – Минск : Новое знание, 2008. – 214 с. – (Профессионалам библиотечного дела).

*1.7. Качанова, Е. Ю.* Инновационно-методическая работа библиотек : учеб. пособие / Е. Ю. Качанова ; науч. ред. А. Н. Ванеев; ХГИИК. – СПб. : Профессия, 2007. – С. 193–201.

*1.8. Клюев, В. К.* Менеджмент ресурсного потенциала библиотеки : учеб.-метод. пособие / В. К. Клюев. – М. : Литера, 2011. – 112 с.

*1.9. Пераверзева, Ю. А.* Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк : вучэб.-метад. дапам. / Ю. А. Пераверзева. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – С. 6–11.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.10. Ракавецкая, Л. І.* Менеджмент у бібліятэчнай справе (тэхналагічны бібліятэчны менеджмент): вучэб. дапам. / Л. І. Ракавецкая ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: Б. в., 2010. – 252 с.

*Дадатковая*

*1.11.* Дискуссионная площадка – интеллектуальные рекомендательные сервисы и профильные сети : дискуссионный семинар / Н. А. Петрушин, А. В. Поляринов, А. С. Тупиков // Современная библиотека. – 2016. – № 1. – С. 40–41.

*1.12. Замаева, Н.* Основные векторы развития библиотек Беларуси в 2016–2020 гг. сквозь призму стратегических документов / Н. Замаева // Бібліятэчны свет. – 2016. – № 3. – С. 8–9.

*1.13. Зыгмантовіч, С. В.* Педагагічныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці / С. В. Зыгмантовіч // Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 52–68.

*1.14.* Обеспечение качества информационно-библиотечного обслуживания: пособие для руководителей библиотек: проект / отв. сост. и рук. проекта Л.В.Куликова; Рос. библ. ассоциация. – СПб. : РНБ, 2013. – То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rba.ru/content/activities/group/kach/13_06_2013.pdf, свободный. – Дата доступа: 17.01.2018.

*1.15.* Разработать методику оценки эфективности деятельности библиотек по созданию электронных информационных ресурсов : отчет о НИР (закл.) / рук. темы Ю. Н. Галковская ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – 2017. – 426 с. – № гос. рег. 20170558.

*1.16. Редькина, Н. С.* Технологический менеджмент в системе управления библиотекой : моногр. / Н. С. Редькина ; Гос. публ. науч.-техн. б-ка Сиб. отд-ния Рос. акад. наук. – Новосибирск : ГПНТБ СО РАН, 2014. – 414 с.

*Раздзел II.*
*Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы*

*Асноўная*

*2.1. Белоновская, И. Л.* Лингвистическое обеспечение АБИС : учеб.-метод. пособие / И. Л. Белоновская. – Минск : БГУКИ, 2017. – 77 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.2. Воройский, Ф. С.* Информатика : энцикл. сист. сл.-справ.: введение в современные информационные и телекоммуникационные технологии в терминах и фактах / Ф. С. Воройский. – М. : Физматлит, 2006. – 768 с.

*2.3. Воройский, Ф. С.* Проектирование подсистемы информационного обеспечения АБИС / Ф. С. Воройский // *Гендина, Н. И.* Лингвистические средства институтов памяти: библиотек, архивов, музеев и организаций смежных сфер деятельности: моногр. / Н. И. Гендина. – М. : Литера, 2016. – 398 с.

*2.4. Голицына, О. Л.* Базы данных : учеб. пособие / О. Л. Голицына, Н. В. Максимов, И. И. Попов. – М. : Форум : Инфра-М, 2009. – 399 с.

*2.5. Голицына, О. Л.* Системы управления базами данных : учеб. пособие / О. Л. Голицына, Т. Л. Партыка, И. И. Попов. – М. : Инфра-М : Форум, 2011. – 431 с.

*2.6. Гребенюк, Е. И.* Технические средства автоматизации : учебник / Е. И. Гребенюк, Н. А. Гребенюк. – 2-е изд., стереотип. – М. : Академия, 2005. – 272 с.

*2.7. Гончаров, М. В.* Практическая реализация библиотечного интернет-комплекса : науч.-практ. пособие / М. В. Гончаров, К. А. Колосов. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2005. – 192 с.

*2.8. Дунаев, В. В.* Базы данных. Язык SQL : для студентов / В. Дунаев. – СПб. : БХВ-Петербург, 2012. – 302 с.

*2.9. Жданова, Т. А.* Основы алгоритмизации и программирования : учеб. пособие / Т. А. Жданова, Ю. С. Бузыкова. – Хабаровск : Изд-во Тихоокеан. гос. ун-та, 2011. – 56 с. – Режим доступа: http://window.edu.ru/resource/402/77402. – Дата доступа: 06.03.2017.

*2.10. Жмакин, А. П.* Архитектура ЭВМ / А. П. Жмакин. – 2-е изд., доп. и перераб. – СПб. : БХВ-Петербург, 2010. – 344 с.

*2.11. Захаркина, В. В.* JavaScript. Основы клиентского программирования : учеб. пособие / В. В. Захаркина. – СПб. : Фак. филологии и искусств СПбГУ, 2007. – 73 с. – Режим доступа: http://window.edu.ru/resource/394/57394. – Дата доступа: 06.03.2017.

*2.12. Зимянин, Л. Ф.* Компьютерные сети: курс лекций / Л. Ф. Зимянин. – Минск : БГУ, 2006. – 336 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.13. Зупарова, Л. Б.* Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Л. Б. Зупарова, Т. А. Зайцева ; под ред. Ю. Н. Столярова. – М. : ФАИР, 2007. – 400 с.

*2.14. Ильина, С. В.* Авторитетные/нормативные базы данных в АБИС : учеб. пособие / С. В. Ильина. – Минск : БГУКИ, 2012. – 97 с.

*2.15. Лазицкас, Е. А.* Базы данных и системы управления базами данных : учеб. пособие / Е. Л. Лазицкас, И. Н. Загуменникова, П. Г. Гилевский. – Минск : Респ. ин-т проф. образования, 2016. – 266 с.

*2.16. Лесневский, А. С.* Объектно-ориентированное программирование для начинающих / А. С. Лесневский. – М. : Бином. Лаборатория знаний, 2009. – 212 с.

*2.17.* Основы проектирования автоматизированных библиотечно-информационных систем / Ф. С. Воройский. – М. : Физматлит, 2008. – Гл. 10. – С. 84–98.

*2.18. Советов, Б. Я.* Базы данных : учебник / Б. Я. Советов, В. В. Цехановский, В. Д. Чертовской. – М. : Юрайт, 2016. – 262 с.

*2.19. Солоневич, А. В.* Компьютерные сети : учеб. пособие / А. В. Солоневич. – Минск : РИПО, 2012. – 158 с.

*2.20. Старков, В. В.* Архитектура персонального компьютера: организация, устройство, работа / В. В. Старков. – М. : Горячая линия-Телеком, 2009. – 536 с.

*2.21. Сычев, А. В.* Перспективные технологии и языки веб-разработки / А. В. Сычев. – 2-е изд., испр. – М. : Нац. открытый ун-т «ИНТУИТ», 2016. – 494 с. : ил. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: //biblioclub.ru/index.php?page=book&id=429078. – Дата доступа: 06.03.2017.

*2.22. Шаньгин, В. Ф.* Информационная безопасность компьютерных систем / В. Ф. Шаньгин. – М. : Форум, 2014. – 416 с.

*Дадатковая*

*2.23.* Единая система программной документации. Схемы алгоритмов, программ, данных и систем. Условные обозначения и правила выполнения : ГОСТ 19.701-90 (ИСО 5807-85) : взамен ГОСТ 19.002-80 : взамен ГОСТ 19.003-80 : введ. 01.01.92 / Гос. ком. СССР по управлению качеством продукции и стандартам. – М. : Изд-во стандартов, 1990. – 26 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.24. Яцэвіч, М. А.* Карпаратыўныя бібліятэчныя сістэмы і іх роля ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў Беларусі // Информационное обеспечение науки Беларуси: прошлое, настоящее, будущее / М. А. Яцэвіч. – Минск : Нац. акад. наук Беларуси, 2003. – С. 42–50.

## *Раздзел III.*
## *Метадычнае забеспячэнне дзейнасці розных тыпаў бібліятэк*

### *Асноўная*

*3.1.* Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні = Библиотечная статистика. Основные положения : СТБ 7.20–2000. – Мінск : Дзяржстандарт: Б.г., 2000. – 6 с. – (Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе).

*3.2. Ахмадова, Ю. А.* Менеджмент качества и библиотека : учеб.-практ. пособие / Ю. А. Ахмадова, Е. Я. Галимова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2007. – 88 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век» ; вып. 55).

*3.3. Ахмадова, Ю. А.* Система менеджмента качества библиотеки : учеб.-практ. пособие / Ю. А. Ахмадова ; науч. ред. В. В. Брежнева. – СПб. : Профессия, 2007. – 260, [4] с. : табл. – (Библиотека).

*3.4. Васильев, И. Г.* Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский. – СПб. : Профессия, 2001. – 176 с.

*3.5.* Издательская деятельность библиотеки : иллюстрированный справочник специалиста / Е. Э. Протопопова, Е. В. Кузакова. – М. : Литера, 2009. – 92 с.

*3.6. Крейденко, В.С.* Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – М. : Рус. шк. библ. ассоциация, 2007. – 351 с.

*3.7.* Проведение маркетинговых и социологических исследований в учреждениях культуры : метод. рекомендации / Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А. И. Герцена, науч.-метод. отдел ; сост. Н. А. Скрябина. – Киров, 2010. – 55 с.

*3.8. Ракавецкая, Л. І.* Менеджмент у бібліятэчнай справе (тэхналагічны бібліятэчны менеджмент): вучэб. дапам. / Л. І. Ракавецкая ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : Б. в., 2010. – 252 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3.9.* Социологические исследования в библиотеке: теоретический и практический аспекты [Электронный ресурс] / Нац. б-ка Беларуси ; сост. М. Г. Алейник ; ред. О. А. Соболевская. – Минск : НББ, 2006. – 26,5 Мб. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

*3.10.* Теория и практика издательского дела: хрестоматия : учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности «издательское дело» / авт.-сост. : В. И. Куликович, В. В. Орлова, О. А. Пригожая. – Минск : БГТУ, 2012. – 469 с.

*Дадатковая*

*3.11. Нохрина, В. А.* Мониторинг входного потока документов в фонд библиотеки как метод оптимизации комплектования / В. А. Нохрина // Библиосфера. – 2013. – № 4. – С. 81–86.

*3.12. Олефир, С. В.* Мониторинг читательской активности : метод. рекомендации / С. В. Олефир. – М. : Чистые пруды, 2008. – 30 с.

*3.13.* Что нужно знать об издательской деятельности : практ. пособие / сост. Е. В. Иванова ; под общ. ред. Е. С. Павловой. – Минск : Нац. кн. палата Беларуси, 2014. – 156 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ПРАГРАМА ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках),*
*напрамках спецыяльнасці*
*1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент),*
*1-23 01 11-02 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (аўтаматызацыя),*
*1-23 01 11-04 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(метадычнае забеспячэнне)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 4,71. Ул.-выд. арк. 3,54. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ